ФОНД ПРЕЗИДЕНТСКИХ ГРАНТОВ

«Берега дружбы» Неклиновский район с. Покровское Ростовская область

V Международный молодежный фестиваль-конкурс поэзии и поэтических переводов "Берега дружбы"

З ЦЕПЛЫНЁЙ НА ДАЛОНЯХ

Ростовская область
Неклиновский район
с. Покровское
2020 г.

З цеплынёй на далонях

Пераклады з рускай мовы

в. Пакроўскае
2020

ББК 84 (2Рос=Рус)-52

З цеплынёй на далонях. Пераклады з рускай мовы.
Растоўская вобласць, г. Таганрог, выдавецтва ІП Ступін С.А., 2020, 102 с.

КНІГА ВЫДАДЗЕНА ПРЫ ФІНАНСАВАЙ ПАДТРЫМЦЫ ФОНДА ПРЭЗІДЭНЦКІХ ГРАНТАЎ РФ

© Аўтары, 2020

Непадзельная еднасць

Паважаныя сябры, чытачы, аматары паэзіі!

Міжнародны маладзёвы фестываль-конкурс паэзіі і паэтычных перакладаў “Берега дружбы” стаў традыцыйнай падзеяй і адбыўся ў гэтым годзе ўжо пяты раз. Традыцыі – гэта добра, але калі яны не застылыя, і калі працэс іх ажыццяўлення звязаны з пастаянным пошукам і ўстойлівым развіццём. Нешта падобнае адбываецца на гэтым праекце, таму што ўдзельнікі яго кожны год здзіўляюць сваім талентам і разнастайнасцю. Вось і ў новым зборніку прадстаўлены вершы дваццаці васьмі расійскіх і ўкраінскіх паэтаў, якія пераклалі на беларускую мову дзевяць гродзенскіх аўтараў. Вершы рознапланавыя па стылі і тэмпераменце, адрозніваюцца па ўзроўню паэтычнасці і вобразнасці, але ўсіх іх аб’ядноўвае перш за ўсё любоў да слова, творчасці, перажыванні за лёсы суайчыннікаў, роднага краю, імкненне да сапраўдных каштоўнасцяў, да пошукаў існасці, да распазнання дабра и зла. Паэтычныя сюжэты распавядаюць пра справы мінулых дзён і падзеі сённяшнія, чалавечыя зносіны і памкненні. І калі гэтыя сюжэты напісаныя прыгожым паэтычным радком, яны абавязкова знойдуць водгук у сэрцах чытачоў. Таму што, паэзія – гэта не толькі адзін з відаў мастацтва. Для многіх яна – асобы строй душы, лад жыцця, своеасаблівае душасховішча, скрынка на боль, скарбонка надзей, свята на кожны дзень.

Асаблівасць гэтага ды й усіх зборнікаў праекта “Берега дружбы” ў тым, што на адной пляцоўцы выступаюць і дэбютанты-пачаткоўцы, і знаныя прафесіяналы. Без зайздрасці знізу і пагарды зверху. Таму, апроч рэалізацыі творчага здабытку, кнігі даюць магчымасць паэтычнага ўдасканалення або параўнання на ўзорах таленавітых твораў, дазваляюць вызначыць уласны патэнцыял і намеціць новыя шляхі. А майстрам дазваляюць не толькі выказацца і прадэманстраваць выдатны ўзровень мастацкага перакладу, а лепш даведацца адзін пра аднаго. Тым самым выконваецца яшчэ адно прызначэнне паэзіі – яднанне яе прыхільнікаў.

Мяркуем, што зборнік паэтычных перакладаў стане яркай з’явай ў культурным жыцці брацкіх краін. Таму што, мы – беларусы, рускія, украінцы з’яўляемся фактычна адзіным народам. Новы зборнік, спадзяёмся, будзе годным унёскам у развіццё нашых сяброўскіх адносін і нагадае пра наша шматвекавое кроўна-гістарычнае адзінства. А паэзія яшчэ раз падкрэсліць жаданне быць разам, мацаваць наша сяброўства і непадзельную еднасць.

З павагай,
старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення ГА “Саюз пісьменнікаў Беларусі”,
член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы

Л. А. Кебіч

Бекрашава Ларыса Аляксееўна, ЛНР, г. Луганск

Нарадзілася ў 1960 годзе. Паэтэса, член Міжрэгіянальнага Саюза пісьменнікаў (МСП), старшыня Луганскага аддзялення МСП. Філолаг па адукацыі, перакладчык (перакладае вершы з англійскай мовы на рускую), старшы выкладчык англійскай мовы ў Луганскім нацыянальным універсітэце імя Уладзіміра Даля. Вершы піша з дзяцінства. Тэматыка твораў самая разнастайная: пейзажная, грамадзянская, лірыка кахання. Публікуецца ў перыядычных выданнях і калектыўных зборніках Луганшчыны, Украіны, Расіі, мае аўтарскія паэтычныя зборнікі і больш за 50 навуковых публікацый, у тым ліку, пра мастацтва перакладу. Захапляецца гісторыяй, партрэтнай графікай, аўтарскай песняй.

Дашко Аляксандр Аляксандравіч, горад Ульянаўск

Нарадзіўся 26 кастрычніка 1994 года ў г. Ульянаўск. Паэт, член Саюза пісьменнікаў Расіі, старшыня Савета маладых літаратараў Ульянаўскай вобласці. Лаўрэат абласной паэтычнай прэміі імя Благава. Занесены ў Залатую кнігу гонару моладзі Ульянаўскай вобласці. Публікаваўся ў часопісах “Маладая гвардыя”, “Родная Ладага”, “Сура”, “Парус”, “Сімбірск”, “Бійскі веснік”, анталогіі маладой літаратуры Расіі “Зара” і ў іншых выданнях.

Жалязоўская Лідзія Васільеўна, г. Краснадар

Нарадзілася 11 сакавіка 1952 года ў Беларускай ССР. У 1975 годзе скончыла фармацэўтычны факультэт Віцебскага дзяржаўнага медыцынскага інстытута. Выйшла замуж за ваеннага лекара, нарадзіла трох дачок. Апошнім месцам службы мужа стаў горад Краснадар, у якім засталіся жыць пасля заканчэння тэрміну службы ў 1998 годзе. Працуе ў дзяржаўнай бюджэтнай медыцынскай установе «Краёвы медыцынскі цэнтр «Рэзерв». Са студзеня 2018 года з'яўляецца членам Краснадарскага краявога літаратурнага аб'яднання «Вернасць» пры Краснадарскім рэгіянальным аддзяленні ГА "Саюз пісьменнікаў Расіі". Вершы піша з трыццаці васьмі гадоў, у канцы лютага 2020 года выйдзе першая кніга.

Звягіна Вольга Мікалаеўна, Краснадарскі край, г. Новакубанск

Нарадзілася 1 студзеня 1986г. у горадзе Новакубанску Краснадарскага краю. Атрымала сяроднюю адукацыю ў школе №3 горада Новакубанска, затым вывучылася на аператара ПК па кірунку графічны дызайн. Мама двух сыноў. Вершы і апавяданні піша з 11 класа. З 2011 года член літаратурнага аб'яднання Новакубанскага раёна "Пошук". Лаўрэат краявых , Усерасійскіх і міжнародных конкурсаў. Вершы ўвайшлі ў раённы зборнік "Вершы + Я". Член Міжнароднага Саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў.

Ткачэнка Алена, ЛНР, г. Луганск

Нарадзілася 25 мая 1994 года ў горадзе Луганску ў сям'і ваеннаслужачага. З 2001 года вучылася ў школе № 11 горада Луганска. З 2010 па 2015г.г. вучылася ў Луганскам дзяржаўным каледжы Культуры і Мастацтваў па спецыяльнасці «Выяўленчае мастацтва», спецыялізацыі «станкавага жывапісу». З 2015 па 2018г.г. вучылася ў Луганскай дзяржаўнай акадэміі Культуры і мастацтваў ім. М. Матусоўскага на факультэце Выяўленчага мастацтва па спецыялізацыі «камп'ютарная графіка». З сакавіка 2019 года працуе ў ГУК ЛНР «Луганскі краязнаўчы музей" на пасадзе мастака-рэстаўратара.

Кебіч (Вайтулевіч) Людміла Антонаўна, г. Гродна

Нарадзілася 17.07.1951 года ў г.п. Краснасельскі Гродзенскай вобласці Ваўкавыскага раёна. Паэтэса, празаік, перакладчык, ганаровы член СПБ. Член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП). Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення СПБ. Узнагароджана нагрудным знакам “За ўклад у развіццё культуры Беларусі” (2009). Пераможца Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу “Лепшы твор года” ў намінацыі “Песенны жанр” за цыкл песень “Словы прызнання”– “Залаты Купідон” (2010). Атрымала дыплом і тытул “Чалавек года Гродзеншчыны за 2013 год”, медаль Францыска Скарыны (2014), медаль СПБ “За вялікі ўклад у літаратуру”(2018). Пераможца абласногга літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі “Паэзія”. Выдала 15 кніг вершаў і прозы, два зборнікі песень. Вершы перакладаліся на рускую, украінскую, азейбарджанскую, літоўскую і польскую мовы. Жыве ў г. Гродна.

Вершы Бекрашавай Ларысы

***

пераклад Кебіч Людмілы

Ізноў вясна, завейкі адшумелі,
і капяжы зрываюцца на крык,
і далячыні разам пасвятлелі,
і ў люты мой уварваўся красавік.
А лютаму так хочацца спакою!
А тут сініцаў невыносны звон!
І, захіліўшы прамяні рукою,
глядзіць так стомлена з-пад вейкаў ён.
На нораў, неапраўдана раскуты,
(такога ён не бачыў на вяку!)
А раптам цуд адбудзецца, і люты
душой сагрэецца ў красавіку?!

***

пераклад Кебіч Людмілы

Абвяду ў календары
тую дату,
бо настане на зары
час расплаты.
За шчаслівы твару лік,
за пярсцёнак з рук тваіх –
час расплаты.
Шэсць пятнаццаць. Ступіш ты
ў глыб вагона.
нас разлучыць дождж густы
ля перона.
Рэйкі выгнуцца змяёй,
колаў стук, і цішынёй
адсячэ зноў гарызонт
мокры парасон.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Лета ўзмахнула кляновым лісточкам дрыготкім –
птушкай параненай запунсавеў на асфальце.
Як кампазітар, паставіў апошнюю нотку
ў толькі закончанай сонечнай летняй санаце.

Вось палымнеюць настуркаў зрыжэлыя донцы,
музыцы ў такт рэверансам схіляюцца кветкі.
Сполахі ў жухлай траве, нібы водблескі сонца,
быццам усмешка, апошняя, сумная, лета…

***

пераклад Кебіч Людмілы

Я б магла не заўважыць лета –
звыкла ўсё: кветкі, пыл да нябёс…
Ды, нібы ў пакаранне за гэта,
грымнуў лівень з вышыняў наўскос.

Расшумелася неба басам,
праціналі маланкі фон,
і прагулка мая не ўдалася,
клён паклікаў – раскрыў парасон.

Я застыла ў абдымках клёна.
Колькі фарбаў у небнай гульні!
І на свет пазіраю ўлюбёна: –
Гэта ж трэба! А летнія ж дні!

Ды як выклік шашы перагрэтай,
кінуў луг свой кваціsты вельвет…
Я б магла не заўважыць лета,
калі б дождж не ўварваўся ў свет!

***

пераклад Кебіч Людмілы

Усё адчайней кружыцца Зямля.
Усё хутчэй гадоў мільганне,
і бачыцца ўсё больш здалля,
каштоўней сонечнае ззянне.

У вераснёвы змрок прылёг,
яшчэ ўсё цёплы і духмяны,
прачнуўся – снег накрыў галлё,
і свет падобен да нірваны.

Прамень апошні хутка згас,
дзень патануў у снезе белым,
калі працяў калючы наст
пралескі парастак нясмелы.

Прыйшла ізноў пара цвіцення,
зноў ручаі бягуць, звіняць…
І верабейка ў захапленні –
гатовы лета ўжо вітаць.

О, Божа! Снег ляціць начамі
на свет, што ранкам не пазнаць.
І кружыцца Зямля адчайна!
Паспець бы…Далюбіць…І даспяваць…

***

пераклад Кебіч Людмілы

Я трызню бяздоннай сінечаю
і ветру свавольным альтам,
але я навечна абвенчана
з гарачым, пякельным асфальтам!

Дзе, узняўшы да неба вочы,
горад стыне ў нервовай позе,
я шукаю пад музыку ночы
паэзію ў цэглавай прозе.

Вершы Дашко Аляксандра

***

пераклад Кебіч Людмілы

На прадвесні ветрана над Волгай,
Нібы над краінай смерч імчыць.
З неба вельмі пільна, і так доўга
Хлопчык яснавокі ўніз глядзіць.

Хмары – як няўрымслівыя коні –
На чале яго пакінуць цень.
Ён заплача і, напэўна, успомніць:
На Зямлі ён быў у гэткі ж дзень.

І дажджы пральюцца над Расіяй,
Квеценню адораць кожны сад.
Хлопчык успомніць, што ён быў Месіяй,
Ды забудзе, як ён быў распяты.

І аднойчы ў квецені прарочай
Мы апынімся на светлай паласе.
Прыйдзе той блакітнавокі хлопчык
І ў руках Расію панясе.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Твой голас, нібы песня з пералівамі,
і ад парфуму шлейф застаўся даўкі.
Ішлі па парку, п’яныя, шчаслівыя,
і вуркаталі, быццам птушак зграйкі.

Быў красавік, гарэзлівыя промнікі
сакрэт наш разгадалі і без слоў:
мы зноў з табой маленькія свавольнікі,
як быццам па шаснаццаць нам ізноў.

А рэчы простыя – ёсць самыя цудоўныя,
ты замалюй іх у нататнік свой.
А я запомню вочы, жалю поўныя,
і пацалунак развітальны твой.

Здаюцца выпадковасці пытаннямі,
я не паспеў знайсці на іх адказ.
Вярнуся да цябе, мая світальная,
і сонечны ўсміхнецца нам алмаз.

***

пераклад Кебіч Людмілы

У моры жоўтых дзьмухаўцоў
хачу забыцца назаўсёды,
бо ў суме не знайсці канцоў
і згоды.

Яны, бы з сонечнай вясны,
народжаныя светлым маем,
у іх гаючай жаўцізны –
без краю.

Гуляюць парачкі вакол
і абдымаюцца салодка.
А дзьмухаўцы знялі рукой
самоту.

Так хутка кветкі адцвілі,
і толькі срэбраныя цені
ўсім закаханым на зямлі
зноў нагадаюць тыя дні,
калі зіхцелі.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Твой пагляд – як у жанчын Рэмарка,
– Не спяшайся! – ціха мне гаворыць.
І крадком блукаю я па парку,
па душы, што мне надзею дорыць.

Тут, у парку, нібы ўлетку, ярка,
шмат цяпла, святла і прыгажосці.
І, нібы героі кніг Рэмарка,
кветкі я краду – іду ж у госці.

І як ад кубінскага ад рома,
раптам захмялее галава…
Мне ў табе нічога не знаёма,
хіба слоў выразная канва

Аб такім жаданым і далёкім,
толькі ўспомніш – сэрца задрыжыць.
Быццам я, самотны, адзінокі,
дождж не змог раптоўны перажыць.

І няхай, шчаслівы, я прамокну,
пра каханне болей не пяю…
Твой пагляд, на іншы непадобны,
помню, нібы маладосць сваю.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Калі холадна – сумна ўдвая,
ды я сэрца цярпеннем скараю.
Сорак птушак – надзея мая –
светлым гімнам вясну запаўняюць.

Нам бабуля ў дзяцінстве пякла
сорак птушак пад веснія гукі.
Помню, як я цягнуў да стала
нецярплівыя тонкія рукі.

Ды дзянёчкі маленства прайшлі
за парканам і белаю брамай.
І па-новаму сэрца шчыміць,
хоць малітвай ратуюся мамы.

Расквітнелі ў блакіце густым
кветкі-воблакі ў белых адзеннях.
Сорак птушак – бы сорак святых,
услаўляюць вясну і надзею.

Вершы Жалязоўскай Лідзіі

***

пераклад Кебіч Людмілы

Дзе я зараз? Што са мной?
І нашта мне горад гэты?
Я даўно хачу дамоў –
Край дзяцінства, светлай мэты.

Закруціўся ў снег пляцень,
Дым з трубы пячной не ўецца,
Брамы скрыпнуць раз на дзень –
Птушкай сэрца страпянецца.

Дом стаіць пусты, стары,
Там жывуць адно ўспаміны…
Ды нясуць душы віры
На спатканне да Радзімы.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Быў казачны вечар. Палала лазенка
з гарачым палком, апякаючым парам.
І лашчыўся венік: “Дай плечы, паненка!”
Бадзёрыў духмяным бярозавым жарам.

Застолле з брусніцамі, вішняй, грыбамі,
Ды з мёдам духмяным і з кубачкам кавы.
Бяседа няспешна цякла паміж намі,
Былыя пачуцці раства ўваскрасалі.

Агонь разгараўся, паленцамі трэскаў.
Спявалі забытыя даўнія песні
Чатыры сястры перад будучым векам, –
Шкада, ды былое, на жаль, не ўваскрэсне.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Косяць адуванчыкі
пад маім акном
Жоўтыя каптанчыкі
падаюць нічком.

Як было мне весела!
Выйду на балкон
і вітае песенька –
весніх птушак звон.

Дзьмухаўцоў няма. Вакол –
Светлая журба.
Колькі сонейкаў цвіло!...
Кветачак шкада.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Баюся зрушыць твой пакой
І разбудзіць неасцярожна.
Ты спіш чулліва і трывожна,
Што страшна варухнуць рукой.

Такія розныя, але
Адзін другога дапаўняем,
Ад лішніх слёз аберагаем
І пазнаём жыццё далей.

А раптам выпадзе (не кпі!)
Пайсці ў той сон, гаротны, вечны,
Не будзь, мой любы, бессардэчны!
Мяне з сабою захапі…

Вершы Звягінай Вольгі

***

пераклад Кебіч Людмілы

Смерці няма.
Мы вернемся белымі птушкамі
У свет, які ў снах нашых гушкае,
Чысты свет.

Болю няма.
Гэта ўсё толькі морак напушчаны,
Каб зрабіліся мы невідушчымі.
Знікне след.

І жыццё – наш сон.
Ён гадамі доўгімі цягнецца.
І пакінуць кожнаму прагнецца
Перазвон.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Зменны графік. Два праз адзін.
Дні – чародка панурых карцін.
Ці то дождж на дварэ, ці то снег?
І жыццё – як бясконцы бег.

Восень вещцем шкрабецца ў шкло,
І па кропельцы лета сышло.
Склела. Холад да скуры праняў.
Ёсць усё і, як быццам, няма.

Позні вечар. Вакол цішыня.
На пытанні адказаў няма.
Ён чакае – стаптана трава.
Графік той жа – адзін цераз два.

***

пераклад Кебіч Людмілы

Раніца. І думка ў сэрцы болем:
Адыходзяць лепшыя, не даіграўшы роляў.
Не дажылі, не дакахалі, не сказалі…
Пайшлі. Матыў жыццёвы абарвалі.

Пустэча сэрца поўніць цішынёй,
Маўчыць гітара лопнуўшай струной.
Адно ўспаміны стукаюць у скронь,
Душу сціскае жаласці агонь.

Ах, непазбежнасць! Крыху памарудзь!
Не збегчы, не забыцца, не заснуць.
Не абрывай датэрмінова ролю,
Не працінай штогод пякучым болем.

Лічбавае мастацтва

пераклад Кебіч Людмілы

Прагрэс заўжды ідзе няўмольна,
Пляце ён будучыні ніць.
Яго прышэсце неадольна,
І не суняць, і не спыніць.

Мастацтва крочыць поруч з часам,
Без межаў і без перашкод.
Захоўвае вякоў запасы
І лічбавы ўжо мае код.

А майстар крыўдзіцца парою:
Хоць кол на галаве цяшы!
Шаптацца ж будуць за спіною,
Маўляў, машына без душы.

А майстар будзе сумна мовіць:
– Стаіць на гэтай праўдзе свет,
Душа маёй рукою водзіць,
Камп'ютар – толькі інструмент.

Мужчына

пераклад Кебіч Людмілы

Яго вочы – сінеча неба,
Сонца промнік у іх гуляе.
Яго вусны – смак сітні хлеба,
Ён мацней за віно ап’яняе.
За абдымкамі рук пяшчотных
Адчуваюцца моц і сіла.
Захавальнік ён ведаў цнотных,
Для яго слова – гук нямілы.
Ён шануе законы чэсці,
Не шукае дарма прычыны
Прычасаць каго супраць шэрсці.
Як і трэба рабіць мужчыне.

Сон

пераклад Кебіч Людмілы

Цябе я бачыў толькі ў сне,
Ты ў ім была на цуд падобна.
І больш няма спакою мне,
Той сон прарочы быў і годны.
І беласнежнаю зімой,
І ў час вясновага цвіцення,
І цёмнаю парой начной
Чакаю я твайго з’яўлення.
А ты, бы канула ў Сусвет,
Дзе адшукаць тваю абіцель?
Няўжо твой прывідны партрэт
Мне толькі ў сне явіў Збавіцель?

Ушакоў Віктар Іванавіч, Растоўская вобласць, ст. Абліўская

Данскі паэт і празаік, аўтар кніг “Крутые повороты” (аповесць, апавяданні, 2020г.), “Запах полыни” (апавяданні, вершы, 2013г.) і трох паэтычных зборнікаў. Яго вершы і апавяданні друкаваліся ў абласных газетах, альманахах і часопісах. Галоўны рэдактар альманаха «Донская глубинка», рэдактар-складальнік калектыўных паэтычных зборнікаў «Там, у Маныча», «Откровение», «Душой дотянуться до Бога». Член міжнароднага Саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў.

Шаблакова Вольга Анатольеўна, г. Бранск

Нарадзілася 7 ліпеня 1968 года ў пасёлку Праўдзінск Балахнінскага раёна Горкаўскай вобласці (г.Балахна Ніжнегародскай вобл.). Скончыла Маскоўскі дзяржаўны інстытут культуры. Жыве ў г.Бранску, працуе загадчыцай школьнай бібліятэкі. Член Саюза пісьменнікаў Расіі, Саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў, узнагароджана нагрудным знакам “Почётный наставник творческой молодёжи МСПМ”, з 2019г. – член Праўлення Бранскай абласной грамадскай пісьменніцкай арганізацыі Саюза пісьменнікаў Расіі. Лаўрэат і пераможца шэрагу літаратурных конкурсаў. Выдадзеныя дзве кнігі (вершы).

Курловіч Віктар Георгіевіч, Гродзенская вобл., Ваўкавыскі р., а/г Вярэйкі

Курловіч Віктар Георгіевіч нарадзіўся 18 лютага 1955 года ў вёсцы Драгічаны Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. У 1976 годзе скончыў фізічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Я. Купалы. Працаваў настаўнікам у школах Ваўкавыскага раёна. Вершы друкаваліся ў перыядычных выданнях абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў, васьмі калектыўных зборніках і альманахах. Выдадзена два асабістых зборнікі паэзіі. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Жыве ў аграгарадку Вярэйкі Ваўкавыскага раёна

Вершы Ушакова Віктара

Валейбол

пераклад Курловіча Віктара

О школьны двор! І валейбол!
Вось даўся ён мне ў знакі…
Ляцелі б лепш у дзённік мой
Вышэйшыя адзнакі!
Ах, як захоплівае спорт!
І б'ю ізноў так моцна я!
І на другі, напэўна, год
Пакіне геаграфія…
Раздаўся кліч: – Лепш пагуляць
З выдатнікам на пару!
Шпаргалкі да мяне ляцяць,
Як мячык ад удару.
Прыціх наш двор. Экзамен.
Стаю, пусты трымаю ліст, –
Ды тройку ўсё ж паставіў
Географ наш, валейбаліст.

***

пераклад Курловіча Віктара

На ўзлёт тваіх вёсел
І цемру ў вачах
Сарвуся пад восень
На рызыку, страх.
Чараты так салодка
Закалыхваюць дзень…
То рване наша лодка,
То сядзе на мель.
І над соннай вадою
Вечар – смуглы сябрук
Нас прыкрые сабою,
Узмацніць сэрцаў стук.

Гаварыла мне мора…

пераклад Курловіча Віктара

Хоць якісьці прасвет. Ёсць адно толькі гора.
Дні пахмурныя хутка мяне захліснуць.
Я шукаў суцяшэння ля берага мора:
Можа, хвалі марскія ўсе беды змятуць?
– Бачу, бачу, твае незайздросныя справы, –
Пераконваў дзед-лодачнік часта дарма. –
Ды што вершы твае? Ні карысці, ні славы
І ўжо попыту сёння на іх больш няма.
Гаварыла мне мора: – Я часта сумую,
Але будзеш сагрэты ты песняй маёй.
Паглядзі лепш на хвалю і дымку марскую,
І на чаек крыклівых балет над вадой…
Так збіраю манеты на дне я паціху,
Толькі чайкі занятыя справай сваёй.
Мае хвалі са мною заўжды, нібы ўздыхі.
Вершы хай застаюцца заўсёды з табой.

***

пераклад Курловіча Віктара

Ідзём па тайзе – і мурашкі ў вачах.
Без вады і без хлеба
зусім затужылі.
І мроіцца мне: быццам лейцы
ў руках,
І цягне вазок мой
гнядая кабыла.
Упэўнены, што ўсё тут здейсніць
змагу я,
У мароз не хаваю
сумленне і нос.
Дык чаму ж тады ў сне
зноў па стэпе бягу я,
І ўсё мроіцца мне
ў стэпе тым сенакос?

Кацярок ты мой, “Цюмень”

пераклад Курловіча Віктара

Кацярок, канечне, развалюха,
Іх снуе па Обі – з краю ў край.
Капітан, здаецца, што “пад мухай”,
Кажа мне: – Чакай, не падганяй.

Кацярок ты мой, “Цюмень”,
Каюта – першы клас,
Але як сядзем мы на мель,
Дык знойдуць кацярок ужо без нас.

Кацярок ты мой, “Цюмень”,
Канаты, якар, рубка…
Па рацыі разы два ў дзень
Шле прывітанне Людка.

Туман – не бачна берагоў.
І капітан не спіць другія суткі,
Ды ёсць збавіцель у яго –
На рацыі з прамбазы Людка.

Вершы Шаблаковай Вольгі

пераклад Курловіча Віктара

Матчына шчасце

З хлапчанём клапот нямала!
Прамільгнулі за акном
Ад вакзала да вакзала
Год за годам, дзень за днём.
Як жа я не разумела,
Шчасце – вось жа, вось яно!
Бо са мною спіць змарнелы,
Стомлены гульнёй сынок.
Што быць побач будзе рады
І нікуды не збяжыць,
І наладзіць беспарадак,
І паблытае рэжым.
А мяне папросіць казку
Паўтарыць на ноч яшчэ.
І душу сагрэе ласкай…
Шчасце – бляск яго вачэй!
Хоць клапот было нямала
І жадання – адпачну,
Шчасце крыламі махала,
Заклікала – ну жа, ну!
Не сумуй, а палюбуйся,
Падрасце – няма яго.
Ды варылася капуста,
Цыравалася трыко.
Магазіны, прыбіранні...
Дзе тут шчасце? Дзе яно?
Час, нібыта з горкі сані,
За маім мільгнуў акном.
Вырас хлопчык, стаў мужчынам,
Не дацягнешся абняць.
Эх, часцей бы бачыць сына!
Вельмі позна шкадаваць.

А можа, купіць чалавечка?

пераклад Курловіча Віктара

У хаце ні кавы, ні грэчкі.
Пара ў магазін мне – купляць.
А можа, купіць чалавечка,
Каб няньчыць яго, мілаваць?

Каб зноў напаўняліся грудзі,
Яго да якіх прыкладу.
Мы вельмі шчаслівымі будзем,
Як час я для казак знайду!

Мае ўжо дарослыя дзеці
Народзяць малому радні.
І будуць на гэтай планеце
Зусім не адныя яны.

А я буду вельмі старацца
Ў палоне вясёлых забаў
Упарта ўсяго дамагацца,
Які б цяжкі час ні настаў.

І з імі асвойваць навінкі
(Я веру ў тэхнічны прагрэс),
Разглядваць у кніжках карцінкі,
Расціць да ўсяго інтарэс.

… Гады не прыкупіш – не грэчка,
Ды толькі не варта тужыць,
Патрэбныя мы чалавечкам,
І нам дзеля гэтага – жыць!

Галчаня

пераклад Курловіча Віктара

Змяшаліся: пажоўклая трава,
Лістоты медзь, дажджы і снегапады.
Сядзіць на агароджы галчаня,
Задрала дзюбу ўверх, шукае праўды.

У мутным небе воблакі імчаць,
І правіць баль усюды непагода.
Ды ўпартае – і халады чакаць
Там застаецца, скуль самое родам.

Ужо зусім нядоўга да зімы…
І жмурыцца крылацік бесталковы
На шэрыя падмоклыя дамы,
Надзьмуты, ён расплакацца гатовы.

Бо не знайсці жучкоў ды чарвячкоў,
Ірве галін марозны вецер плеці.
І агароджу грэючы бачком,
Падрослы птах маркоціцца аб леце.

***

пераклад Курловіча Віктара

Жыць бы мне ў гарадку невялікім ля гор,
Дзе на піках снягі не знікаюць.
Дзе вачам адкрываецца вечны прастор,
І зямля пад нагамі святая.

Ні аб чым не шкадуючы, цешыць свой зрок,
Успрымаць свет нябёсаў як існасць.
І цягнуцца душою, як кволы расток,
І цаніць у жыцці рэчаіснасць.

Ды мне іншая дадзена сёння зямля,
І яна для мяне як апора.
Тут свая прыгажосць, і люблю яе я
Нашмат болей, чым горы і мора.

Мары марамі хай застаюцца! Бо ў іх,
Як у казачным свеце, на памяць,
Захаваць удаецца хаця б толькі міг,
Што рэальнасць без жалю разваліць.

Нямецкі танк на Буйніцкім полі

пераклад Курловіча Віктара

Музейны экспанат, ён кланяецца полю,
Дзе, можа, скрытыя часоў былых пластом,
Ляжаць тут без імён, хто захлынуўся боллю, –
Варожая душа з падціснутым хвастом.

Але, што тут было? Мост рухнуў пад навалай?
Ці камандзірскі танк чамусьці ўзяў правей?
Ці збегчы неяк мо ўдалося генералу,
Або яго сабе забрала Друць навек?

Ды толькі выйшла так: танк апынуўся ў рэчцы,
Пад тоўшчаю вады хаваўся шмат гадоў.
І мулам зарастаў. Ды хлапчукі бяспечна
Залазілі ў яго знайсці хоць што ізноў.

Раскрадзены амаль, як быў дастаны толькі,
Ды вернуты, і вось – стаіць на ўсіх вятрах.
Забраўшыся наверх за дзень ужо раз колькі,
Тапочацца па ім вясёлая дзятва.

Малым не страшны ён, жалезны звер шалёны
Пад мірным небам у абдымках цішыні.
А поле дываном накрытае зялёным,
Як быццам не было ніколі тут вайны.

Андрыянава (Кніга) Крыстына Уладзіміраўна,
Рэспубліка Башкартастан, г. Уфа



Паэт, журналіст, перакладчык. Член СП і СЖ РФ, кандыдат філалагічных навук. Публікавалася ў літаратурных часопісах Расіі, Германіі, Турцыі, газетах Расіі і Казахстана (у перакладзе). Аўтар 3 зборнікаў; сааўтар 24 літаратурных зборнікаў, альманахаў і анталогій. Лаўрэат і фіналіст конкурсаў і фестываляў. Неаднаразовы пераможца (2009, 2011) і фіналіст рэспубліканскага конкурсу перакладаў. Падборкі аўтараў у перакладах апублікаваны ў СМІ і шасці кнігах. Супрацоўнічае з кампазітарамі. Працуе рэдактарам, сцэнарыстам ГУП ТРК «Башкортостан».

Чакунова Маргарыта Генадзьеўна, г. Цюмень

Нарадзілася ў 1993 годзе. Закончыла журналісцкі і філалагічны факультэты. Акуналася ў розныя прафесіі: здымала кіно ў Цюмені, працавала журналістам на тэлебачанні і ў газеце. Член Саюза пісьменнікаў Расіі. Публікавалася ў “Літаратурнай газеце”, часопісах “Наш современник», “Врата Сибири”, “Бельские просторы”.

Лазарчык Таццяна Леанідаўна, Гродзенская вобласць,
г. Ваўкавыск

Нарадзілася 22 жніўня 1974года ў вёсцы Студзенікі Свіслацкага раёну Гродзенскай вобласці. У 1997г скончыла Гродзенскі медыцынскі інстытут і была накіравана ў горад Ваўкавыск Гродзенскай вобласці на працу. У гэтым горадзе жыве і цяпер. Працуе ўрачом-тэрапеўтам (загадчыцай тэрапеўтычнага аддзялення) Ружанскай гарадской бальніцы. Піша вершы з дзяцінства. З 2002 года вершы рэгулярна публікуюцца на старонках раённай газеты «Наш час» Ваўкавыскага раёна, а з 2017года і на старонках газеты «Раённыя будні» Пружанскага раёна Брэстскай вобласці. Мае два выдадзеныя зборнікі вершаў. Піша на рускай і беларускай мовах. Замужам. Мае двух сыноў.

Вершы Андрыянавай Крыстыны

Давай паедзем на алтай

пераклад Лазарчык Таццяны

Давай паедзем на Алтай –
Ад гарадоў сляпых і душных,
Ад зайздрасці вачэй жаўтушных –
Туды, дзе волі цераз край.

Туды, дзе лёгка так спяваць,
Дзе крывадушнікаў забудзем,
Дзе ёсць зусім другія людзі –
Каб лёс туманам спавіваць.

Дзе атрымае крылы міф,
Жылі дзе скіфы і сарматы –
І дзе ніхто не вінаваты
Ні за сябе, ні за другіх.

Давай туды, дзе за спіной
Нам не дадуць характарыстык,
Дзе правядзе ўпарты містык
Па сцежках зорных нас з табой.

Там сінявокі Алтынь-Кёль,
Там гутарыць з Катунью Бія…
Хай запаведная Расія
Нам шчасця назаве пароль.

Ні крыўд, ні плётак не лічы,
Бо свет пакінула надзея…
Давай аб тым, што душу грэе:
Алтай – туды б нам уцячы!

Кніга

пераклад Лазарчык Таццяны

Гэта кніга твая – галасы старажытных лясоў;
Гэта кніга твая – бы званочкі галосныя рэк;
Поўнач чыстых азёр, што грахом не крануў чалавек –
Гэта памяць сям'і – не зачыніш яе на засоў.

Гэта кніга твая – кніга роду, у які ён прыйшоў
Сінявокі, маленькі, усмешлівы наш з табой сын.
Кніга бацькі твайго. Дык чытай, не хвалюйся ўжо –
І на памяць паведай нам сотні прыгожых былін.

Гэта кніга твая – карагод беларускіх бяроз,
Харaство каляровых лугоў, залатыя палі…
Калі разам чытаем гісторыю шчасця і слёз –
Гэта кніга агульная, наша: адна на дваіх!

***

пераклад Лазарчык Таццяны

Горкія песні спявала бабуля –
Ода народнай тузе.
І зразумець не магчыма, чаму я
Сэрца тапіла ў слязе.

Словы ў песні гучалі сурова –
Як жа герояў шкада!
Тыя сюжэты, знаць, не выпадкова
Зноў заступіла бяда.

Зноў не шанцуе героям у песні,
Як іх душой палюбіць?
Толькі той голас далёкі ўваскрэсне,
Каб аб былым галасіць.

***

пераклад Лазарчык Таццяны

У ноч на Сёмуху памёр дзед.
Было трэцяе. Чэрвень ззяў.
Бессмяротных не носіць свет,
Недзіцячых хапае спраў.

Стане дзень гэты не на год
Не па-летняму хмурым – і
Што з таго, што нямецкі род
Лютэранства насіў у крыві?

Ды далёка ад родных ніў
Збудаваў смелы продак дом.
Не на Майне свой хмель варыў –
Можа быць, за адным сталом

З казакамі братаўся дзед –
Хто ж успомніць аб тым цяпер…
Не змагу дараваць сабе:
З роду там не была, павер.

Толькі яркую чую стэп,
Толькі гонар вятроў пяю…
Дзе б дарогу знайсці мне, дзе
ў Малоросію не маю?

Запарожжа схавана там,
Дзе ў думках – чужыя сны,
Дзе па венах і па часах
Разліваецца свет вайны;

Дзе на здымку малы хлапец
Дабрыні выпраўляе дні –
Сонца там прадаўжае грэць,
І яшчэ не ідуць баі;

І яшчэ не мільгае Русь
Гарадамі ў душы тваёй –
І не множыць Ваўчанка сум,
Не вітае нас Белібей…

Усё ж паўднёвае сонца там.
Пералётнае сонца, дзед…
Ярка ззяе славянскі храм –
Алеманскай аправы квет;

У ноч на Сёмуху зорка там
Нарадзілася, можа быць…
Усё мінае.
Любы майдан.
Храмасомам – заўсёды жыць.

Песня стэпняка

пераклад Лазарчык Таццяны

Лета ўпала пад націскам зорак і мар,
Свеціць месяц – купальскае дзіва,
Без малітваў і літасці да шэрых хмар,
Так імкліва, прыгожа, праўдзіва.

Лета ўпала пад небам пакут на раллі,
Там, дзе стэп сакаліная ўецца
Ганарлівай і горкаю песняй зямлі
Аб апошнім прыстанішчы сонца.

Хай ідзе на ўсход па жыцці качаваць,
Дзе расплаўлены ў цюрках славяне…
Мне князёўну чужую мячом не дастаць,
Хай другіх прыкмячае і маніць.

Хай лягенда стралою па стэпе ляціць,
Пад купальскаю зоркай праклятай…
Мне з чужое крыніцы ніколі не піць:
Лета ўпала пад небам зацята!

Вершы Чакуновай Маргарыты

З дзяцінства

пераклад Лазарчык Таццяны

Глытаю, змяшаўшы з гордасцю,
Слёзы крыштальных вод.
Было гэта некалі восенню,
Ішоў мне дванаццаты год.

Зноў паспрачалася першая,
Думка суровая ўраз:
– Навошта прырода здзейсніла
Да болю смешнымі нас!

Узняцца хацелася ў звонкую
Хмарна-бязмежную высь,
Каб раз'яднаць з перапонкаю
Зямлі нетрывалую ніць.

Дзінькалі зоркі-гарошыны
Плыў голас іх здалёк:
–Хопіць гульні няпрошанай,
Любы ты мой матылёк!

***

пераклад Лазарчык Таццяны

Паведайце мне аб анёлках,
Бо ноч завяршае свой бег.
Спіць рэха, стаміўшыся ў ёлках,
За вокнамі падае снег.

На сценцы старой рог архара
Скруціўся ў ззянні лампад.
Усходы, паўстанні, пажары
Прыціхлую, клічуць назад.

Ды будзе нябеснаю крэска,
Ды будзе зямною карцеч.
Вядома, расхрыстанасць – трэска,
Што лёгка падкінуць у печ.

Ідальга, змагаемся з млынам,
За волю крычым, ганім час,
З тугою і гонарам стынем,
Ці ж душы бязконцыя ў нас?..

Відушчым стаць – страшная справа.
Ці скочыш у бездань? Давай!
Дзе доказ – ёсць небная з'ява
Для той, што галосіць: – Трымай!

Ужо не сагрэцца дыханнем,
Бо згінула недзе цяпло.
Тут штучныя веды і званні,
І склад, і мароз, і святло.

Ствараецца голас штодзённа
На гэтай планеце. Амінь!
Чаму ж тыя вочы сцюдзёна
Глядзяць з амаль шэрых глыбінь!

Узрост мой – ад сну абуджэнне,
Марсельеза дзіцячага "я".
І што значыць уваскрасенне
Нам, стомленым ад небыцця?!

Негераічная гісторыя

пераклад Лазарчык Таццяны

Жанна, атака злева! Жанна, атака зправа!
Жанна клінком фехтуе, хай ан аван – ар’ер.
У замку танцуюць панны, фрэйліны сталай драмы,
І выяўляюць слёзы, гледзячы на кар’ер.

Жанна спадніц не носіць. Жанна не носіць блузкі.
Жанна не носіць гневу ў сэрцы, яно ў імгле.
Але калі свет вузкі, ды так бязмежна вузкі,
Жанна адкажа словам, церпкім, як бажалье.

Жанну кахае лучнік, рыцар і капельмайстар.
Жанна сябе не любіць, боек не мінаваць.
Жанна змагацца будзе, але не без прытворства:
Вырашыла з маленства – жонкай ёй не бываць.

Жанна зямлю не любіць. Жанна імкнецца ў неба.
З гэтых нябёс аднойчы да Жанны спусціўся меч.
Жанна ідзе направа, і не дай Бог улева,
А калі крочыць проста – бачна дрыжанне плеч.

Жанна каня сядлае і заязджае ў гліну,
Жанна смялей старога, бывалага шэўрале.
Жанне смяюцца ў рупар, Жанне смяюцца ў спіну,
Жанне смяюцца ў масках, аддаўшы ў палон яе.

Палон. Ёй падпішуць вечнасць і чараўніцтва небыль.
Жанне прыпішуць зелле, даўшы расправе ход.
Полымя – каляснiца: Жанна паедзе ў неба.
Хопіць ужо смяяцца! Ці вам адчыніць праход?!

Жанна, атака злева! Жанна, атака зправа!
Жанна клінком фехтуе, хай ан аван – ар’ер.
У замку танцуюць панны, фрэйліны сталай драмы,
І выяўляюць слёзы, гледзячы на кар’ер.

Жанна спадніц не носіць. Жанна не носіць блузкі.
Жанна не носіць гневу ў сэрцы, яно ў імгле.
Але калі свет вузкі, ды так бязмежна вузкі,
Жанна адкажа словам, церпкім, як бажалье.

Жанну кахае лучнік, рыцар і капельмайстар.
Жанна сябе не любіць, боек не мінаваць.
Жанна змагацца будзе, але не без прытворства:
Вырашыла з маленства – жонкай ёй не бываць.

Жанна зямлю не любіць. Жанна імкнецца ў неба.
З гэтых нябёс аднойчы да Жанны спусціўся меч.
Жанна ідзе направа, і не дай Бог улева,
А калі крочыць проста – бачна дрыжанне плеч.

Жанна каня сядлае і заязджае ў гліну,
Жанна смялей старога, бывалага шэўрале.
Жанне смяюцца ў рупар, Жанне смяюцца ў спіну,
Жанне смяюцца ў масках, аддаўшы ў палон яе.

Палон. Ёй падпішуць вечнасць і чараўніцтва небыль.
Жанне прыпішуць зелле, даўшы расправе ход.
Полымя – каляснiца: Жанна паедзе ў неба.
Хопіць ужо смяяцца! Ці вам адчыніць праход?!

***

пераклад Лазарчык Таццяны

Халодны ты, здаволены, калючы.
Я – прамянём у шыбу, я, пявучы,
Лячу я, зумер рэзкі, надламаны.
Я йшоў па нітках сэнсаў – правадоў,
Ляжаў, як пыл пад цяжарам слядоў.
Хай непрыкметны, ды, усё ж, сказаны.

Ты думаеш я – свет. Я буду светам.
Мая насмешка – поўная сакрэтаў,
Ярчэй праступіць, чым наступны ранак.
Душа, як скрыпка. Закрані струну,
Я навылёт усё перавярну,
Бо цягне да сябе мяне світанак.

Бязглуздзіца, ты скажаш. Можа быць.
Ты будзеш гнаць мяне. Але забыць
Ці зможаш? Запытаеш, можа, гугла,
Дзе мой выток. Не ў сетцы правадоў.
Скажу: прабач, ты, мабыць, не гатоў.
Ты – чалавек. Няўжо душа патухла?

Я пакажу, як плачуць на таргах.
Я пакажу, як мерзнуць у снягах,
Хто на грашы жыве са шчырым сэрцам.
Скажу – ты вельмі ўпарты і сляпы,
Што не люблю кватэрныя скляпы.
Ты хочаш скерца? Я зайграю скерца.

І ў вечнай той мелодыі жывой
Папраўлю дысананс тваёй крывой,
Што так імкне ў бяссэнсавае поле.
Ты – вось, а твой цэйтнот – верацяно,
Зламай яго, заведзена яно,
Здаровым будзь. Хварэць не трэба болей.

Навошта мне надуманы фінал.
Ты жыў, як жыў, не ведаў, не гадаў
Другога мімалётнага імгнення.
Закалышу цябе, і ты заснеш,
Да ног спадзе хлусня. Але найперш
Чакае сэрца зноў перастварэння!

Метафары

пераклад Лазарчык Таццяны

Захад руды праплываў у акне,
Пер'е Жар-птушкі ў руках!
Калі душа мая не ўва мне ,
Госпадзі, гэта жах?!

Фенікс – з попелу, з сажы – Пегас,
Словам вар'яцкім – прастор.
Захаду кнот патух у свой час…
Сэрца маё – дакор?!

Нічога не будзе цудоўней за права
Свечку ў цемры паліць.
Гарызантальна, улева, управа
Думкі свае спяліць.

І, асвятляючы строй няўдзячны
Постацей і вяршынь,
Воклікам быць, ці гульнёй дзіцячай,
Знакам тваёй душы.

Можа, вандроўнікі рэк і мораў
Вызначаць мой маяк,
Якары кінуць сяброўскім хорам.
Толькі калі і як?!

Дзік Мікалай Францавіч, Растоўская вобласць, г. Азоў

Публіцыст, празаік і паэт.

Сябра Саюза журналістаў Расіі, Саюза пісьменнікаў Расіі, Міжрэгіянальнага Саюза пісьменнікаў і Саюза літаратараў Еўропы.

Мікалай Францавіч - выдатнік народнай асветы, аўтар больш за 80 кніг па педагогіцы і методыцы выхавання, 4 кніг прозы, 4 кніг публіцыстыкі і 16 зборнікаў вершаў; лаўрэат і сябра журы больш дваццаці ўсерасійскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў; кавалер сямі медалёў і чатырох ордэнаў Міжнародных і ўсерасійскіх грамадскіх арганізацый. г. Азоў Растоўскай вобласці

Раманенка Віктар Андрэевіч, Краснадарскі край, г. Гарачы Ключ

Нарадзіўся 10.03.1952г. на Паўднёвым Урале, украінец. Пераняў у сям'і гутаркавую ўкраінскую мову, развіў яе да літаратурнай. Адукацыя тэхнічная: інжынер-металург. У 2000-х гадах сем гадоў жыў і працаваў галоўным інжынерам Побужскага металургічнага камбіната ў Кіраваградскай вобласці Украіны. У гэты час (мова укр.) кампазітарам Леанідам Папернацкім была напісана песня «Карпаты», якую выканаў спявак, заслужаны артыст Украіны Аляксандр Васіленка. Яна ўвайшла ў альбом «Трускавецкая Фіеста».

Сямінскі Пётр Яраслававіч, г. Гродна

Нарадзіўся 29.05.1963года. Жыве і працуе ў г. Гродна. Настаўнік. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Аўтар з'яўляецца лаўрэатам конкурса "Залаты Купідон" у 2014 годзе за кнігу "Сузор'е фарфоравых шчанюкоў" у намінацыі "Прыгодніцкая літаратура і фантастыка". Пераможца абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі "Проза". (2020) Аўтар каля дваццаці кніг прозы і паэзіі. Добры арганізатар літаратурных мерапрыемстваў, часты госць у навучальных установах горада і вобласці. Кіраўнік клуба "Цені Пегаса" пры гарадской бібліятэцы №10. Член Савета Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вершы Дзіка Мікалая

Забудзем пра дрэннае

пераклад Сямінскага Пятра

Забудзем пра ўсё дрэннае, сябры,
часовыя душы даруем зрывы,
не будзем больш спрачацца да пары,
разбудзім далікатныя парывы.
Усім дакажам: талент наш любы
імпэтны, а ўсё дараваць імкнецца,
гарантам застанецца назаўжды
сяброўства даўняга, між іншым – сэрца.

***

пераклад Сямінскага Пятра

На з'езджаны гасцінец не звярну.
Шукаю нетаптаныя сцяжыны.
А шчасце давяраю будану,
дзе ёсць каму пазацыроўваць крыўды.
Дзе абяцаюць шмат – я не змаўчу.
Не вытрымаю там, дзе пустаслоўе.
Я сцежку між валошак пратапчу,
дзе балабол мне не псуе здароўе.
Прывабным, лёгкім, вобразным да слёз
зашмальцаваным словам не паверу,
не выбавяць яны таго, хто лёс
Будуе справамі, а не хлуснёй без меры.
Таму на трон пакуль і не ўзышоў.
І ў крэсле больш за дзень я не ўтрымаўся.
Не памяняў душы на дзеяслоў
пад гукі нот спакуслівага вальса.
У вушка не пралазіў пры дзяльбе,
за стос грахоў вымольваў дараванне,
прасіў, каб тут, у сціплым будане,
сябрам маім хапіла частавання.

Холадна мне...

пераклад Сямінскага Пятра

Зорныя россыпы ціха кладуцца
зверху на коўдру блакітнага шоўку.
Снегу шматкам да вышынь не вярнуцца,
падаюць ніцма. І холадна зноўку.

Хутка ўзгадае пра злосць завіруха,
ліха абудзіць свае каруселі,
самаабгонным паспешлівым рухам
ветрам прыўздымецца вэлюм на белі.

Ад адзіноты мне сумна, маркотна,
думкі тугой аддаляюць учынак.
Холадна мне, а на сэрцы гаротна.
Ноч прыхаваная шалем сняжынак.

Сябрам

пераклад Сямінскага Пятра

Чым болей пройдзена дарог,
тым адчувальней сталі раны,
часцей у госці на парог
сябры – амаль што ветэраны.
Апанавала сівізна,
а стукі сэрцаў узмацнелі,
бо мы не дапілі да дна
зіхоткае надзеі келіх!
Яшчэ мы з вамі пажывём,
у крэсла ўтульнае не збочым,
уздым адужым, не звярнём
і разам зноў далей пакрочым.

Вершы Раманенка Віктара

Жанна д'Арк

пераклад Сямінскага Пятра

балада

Жанна д'Арк, Арлеанская панна,
Часу радкі пра цябе не суняць.
Неба абранніца, подзвіг твой ратны,
Будзе ў гісторыі зоркаю ззяць.
Бачыла ты, як Айчына стагнала
У кайданах той бясконцай вайны ...
Як твой народ жыў, нястачай скаваны,
Не разгінаў спрацаванай спіны.
Праз пакаленні цярпеў ён нягоды.
“Выйсця няма”, – быў упэўнены люд.
Горда паўстала за гонар, свабоду,
Юная панна, рашучасці цуд!
І на раўніне, як мора шырокай,
Стаў твой народ, што знямогся ад бед.
Ты – камандарм! І ажно за аблокі,
Гук пераможны табе чуўся ўслед.
Крок да галоўнай мо быў перамогі…
Здрада і жорсткі варожы палон…
Суд інквізіцыі – здзек не ад Бога…
Ты на калені не стала ў паклон!
Смерць – не канец. Не заплюшчыла вочы,
Ты не здалася мячу і кап’ю,
Лёс быў табе не на вогнішча крочыць –
Крочыла ты ў бессмяротнасць сваю!
Небу над светам свяціцца старанна.
Часу ніколі свой рух не суняць.
Жанна д'Арк, Арлеанская панна,
Будзе імя тваё зоркаю ззяць!

Жыць насуперак…

пераклад Сямінскага Пятра

Насуперак былым жыць дням,
мінулым думкам сурагатным,
юначым мроям-дзівакам
вярнуць настрой заўжды выдатны.
Жыць супраць глупства, супраць крыўд,
бяздушнай апраметнай цемры,
Жыць супраць горкіх слёз наўзрыд
і лёсу межаванай меры.
Назло флюідам злосці жыць,
пакутам, што ў любым куплеце...
Пакуль каханне – спеў душы,
пражыць назло ўсяму на свеце.

Надзея

пераклад Сямінскага Пятра

З нябёсамі бываю шчыры,
часцей, чым, можа, сам з сабой,
калі вяду я рэй без ліры
з пайшоўшай з іншым зоркай мрой.
У той размове мала сэнсу,
бы ў гронцы бэзу спарыша.
На ліст надзея застаецца
з зваротным адрасам – “Душа”.
Напоўнены надзеяй келіх
вось-вось пральецца цераз край ...
Пакінуць, струны каб балелі,
Ці ачуняць – сам выбірай.

Этыка

пераклад Сямінскага Пятра

О, этыка – навука аб маралі!
Яна ўзыходзіць ад часоў былых.
Яна мараль паклала на скрыжалі,
Каб драм у лёсах менела людскіх.
З тае пары маральныя каноны
Для ўсіх былі вяхамі ад святых,
І забыццё няпісаных законаў
Грахом было для лёсаў трапяткіх.
Гады бягуць. Эпохі, быццам крыгі…
Да новых межаў наш імкнецца лёс.
Забойцы іншыя чытаюць кнігі,
А дзе цяпер маральных нормаў стос?
Ах, этыка – забытая навука.
А мо яна вышэй за ўсе з навук!
Мярзотны ўчынак... А вакол ні гука,
Ніякага раскаяння, пакут!
І гідзіцца да болю хуліганства.
Пячонку рэжа злосны вандалізм.
І засціць лёс сусветнае нахабства.
Бязлітасны дужэе тэрарызм.
Ды спадзявацца хочацца спрадвеку,
Што прыйдзе, прыйдзе той жаданы век,
І ў кожным чалавеку – Ча-ла-ве-ка
Душою будзе бачыць чалавек!

Непадзельная еднасць

пераклад Сямінскага Пятра

Дзе і кім бы нам ні нарадзіцца –
Выбар неба заўжды ад душы.
Я з'явіўся на свет украінцам
У прывабнай расійскай глушы.
Я сталеў, разумнеў клас за класам,
Родны край спасцігаў спаквaля,
Але снілася іншая часам,
Чымсьці блізкая сэрцу, зямля.
Хай Юнацтва адбегла за далі,
А свядомасць жадала сустрэч,
Бо ўва мне шчыра пасябравалі
Рідна мова і русская речь.
Пад расейскім заўжды ветлым небам
Стаў я тым, кім хацелася стаць,
А цягнула за мроямі следам
Украіну ўсім сэрцам вітаць.
Мне нябёсы здзяйсненне паслалі:
Бачу я праз уражанняў шквал
І дняпроўскія вабныя далі,
І карпацкі круты перавал,
Ціхіх сёлаў жывыя крыніцы,
Гарады з гаманой без мяжы,
Мінакоў, што плятуць небыліцы,
Цвінтароў пасівелых крыжы.
Хай балючыя сёння ўспаміны,
Сэрца покліч не ўтойваю я:
Як ты рідна мне, ненько Ўкраіна,
Як ты люба, Расія мая!

Малітва

пераклад Сямінскага Пятра

Упаду прад Небам за парадай.
Божа наш, пытаюся ў цябе:
– Падкажы нам, давядзі да ладу,
Як знайсці гармонію ў сабе?

Свет зямлі – жывы і непаўторны...
Шлях у ім – заблытаны круіз.
Мы вышэй за ўсіх у свеце зорным,
Але часам падаем ўніз...

І заўжды знаходзяцца прычыны –
Колькі памяць мае род людскі –
У змаганнях грэшнікі-мужчыны,
І ў слязах ад смутку іх жанкі...

Берагчы б нам матухну-прыроду,
Лёсу ўлонне славіць бы найперш!
Мы ж зямлі, вадзе нясём нягоду,
Узнялі да неба дымны смерч.

І амаль свядома да знікнення –
Як ні горка гэта ўсведамляць –
Мы жывёл, раслін сляпым памкненнем
Кожны год працягваем знішчаць.

Забываем пачуццё і меру,
І табу біблейскіх рвём мы стос,
І таму здаецца нам хімерай
Шчасце, што не ўпісваецца ў лёс.

Я ўпаду прад Небам за парадай.
Божа наш, пытаюся ў цябе:
– Падкажы нам, давядзі да ладу,
Як знайсці гармонію ў сабе?!

Раўчанка Вольга Іванаўна, г. Гомель

Член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы (2015), Саюза пісьменнікаў Беларусі (2013 года), прадстаўнік Міжнароднай гільдыі пісьменнікаў у Рэспубліцы Беларусь (2011). Нарадзілася 5 верасня 1954 года ў Ленінскім раёне Джалалабадскай вобласці Кіргізскай ССР. У 1976 годзе скончыла факультэт іспанскай мовы Мінскага інстытута замежных моў, у 1995 – ФПК і ПК Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, у 2001 – Маскоўскі міжнародны лінгвістычны цэнтр. Выкладала замежныя мовы, працавала перакладчыкам.

Кандаурава Наталля, Бранская вобласць, г. Жукаўка

Нарадзілася ў п. Тросна Жукоўскага раёна Бранскай вобласці 19 лютага 1986 года. У 2002 годзе скончыла Троснянскую сярэднюю школу, у 2009 – з адзнакай – Арлоўскі дзяржаўны інстытут мастацтваў і культуры, спецыяльнасць па дыпломе – бібліятэкар, бібліёграф, выкладчык. Працуе бібліятэкарам чытальнай залы Жукоўскай цэнтральнай бібліятэкі. Член Бранскага абласнога літаратурнага аб'яднання Бранскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Расіі. Дыпламант і пераможца абласных і ўсерасійскіх літаратурных конкурсаў. Аўтар кнігі «У дзвюх хвілінах ад раю».

Смолка Вікторыя Валер'еўна, г. Гродна

Нарадзілася 22 сакавіка 1996 года ў г. Гродна (Беларусь). Вершы піша з 6 гадоў на беларускай і рускай мовах. Выпускніца ГрДУ імя Янкі Купалы, філалагічнага факультэта, спецыяльнасці «Беларуская філалогія», а таксама магістратуры ГрДУ імя Янкі Купалы па спецыяльнасці «Літаратуразнаўства». Аспірантка 1 курса Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук па спецыяльнасці «Тэорыя літаратуры. Тэксталогія». Працуе педагогам дадатковай адукацыі ў ДУА «Сярэдняя школа № 39». Вершы друкуюцца ў перыёдыцы і калектыўных зборніках Беларусі, Расіі, Польшчы. Аўтар двух паэтычных зборнікаў, а таксама паэтычных святочна-віншавальных паштовак «З вершаняткавай дзюбкі». Член Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Вершы Раўчанка Вольгі

пераклад Смолка Вікторыі

У неаплатным даўгу

Лаўр жавала піфія.
Донны – Доны Ціхія.
(Радкі Эмы Прыбыльскай, унучкі данскога казака –
пра мяне)

Былы хутар Плятнёў.
Царква, школа – адна з лепшых у вобласці войска Данскога.
Прадзед за жонку турчанку прывёз:
каву варыла, паліла кальян, дзяцей нараджала – і баста!
Кім была ў мінулым жыцці? Тайна, пакрытая цемрай.
Дзед, Іван Міхайлавіч Панамароў, камандзіраваны быў Войскам
у Бесядзь, пад Ветку, да мясцовых казакоў.
Там сасватаў Алёну, у Андрэеўцах стаўшую Лёнай,
прысвечанай у казачкі.
«Беларусы – вы!» «А Вы, бабуля, – хто?» «Казачка!» – і баста!
У Беларусі дзядуля выглядзеў сабе зяця:
хлопцу – ад народзінаў год. Пасадзіў на шыю...
Вырас хлопец – лісты пісаў. Сасватаў малодшую дачку.
(Я на шыі ўнукаў нашу: ад дзеда і бацькі звычка засталася).
Вораг народа – дзядуля –
дзесяць гадоў адтрубіў у Варкуце на лесапавале.
У жывых не застаў бацьку: спазніўся – на пару дзянькоў.
Сын – Георгій – з вайны не прыйшоў,
памёр у Польшчы ад ранаў у кастрычніку сорак пятага года.
Наведалі магілу Жоры ў Познані сёстры – Таня і Шура,
у дні Чарнобыльскай катастрофы, – пра што ў той час не ведалі.
Па прыездзе з Польшчы ў Андрэеўцы ад радыяцыі ўнукаў ратавалі.
Мяне гадавалую ахрысцілі ў Андрэеўскай царкве.
Вярнулася – у пяць гадоў.
Глядзелі «Максімку» ў кіно, на вячэрнім сеансе.
Святло запалілі – усё пальцамі тыкаюць ў мяне: «Максімка!»
Каравокая, валасы – дробным нячысцікам, у матроскім касцюме...
Ад славы не было куды падзецца! Максімкам так і празвалі...

Я ў Андрэеўку не вярталася.
Цётка ездзіла ў адпачынак на радзіму кожнае лета.
Адрасы згубіліся. Гісторыя адышла ў нябыт.
Заставаліся стрыечныя ў Андрэеўцы...
Не распытала – што? як? – пакуль жывыя былі родныя.
Памятаю дзедаў дом – над Салам, адняты вішнёвы сад,
тут*о*ўнік, бахчу – за базам, жыўцом у вядры кіпячыя ракі,
хлеб хатні, летнюю печ, курапаткавыя яйкі ў печцы –
у рукавіцы: дзядуля параніў птушку касою.
Каршун усіх *курапчанятаў* пацягаў – безабаронных.
Ледзь не плюнуў у мяне вярблюд – не магла наглядзецца...
Націск у слове «вішн*е*й» на Сардзініі мне нагадаў стары:
вярнуўся з вайны, удзячны рускім,
памятаючы Дон сорак трэцяга года...
У Луку з Дона ніхто з вайны не прыйшоў...
Італьянцам, палякам скажу: «Дзед мой – казак», –
дранцвеюць ад страху!”
Былі ў родзе бацькі і паўстанцы Касцюшкі...
У спісах загінуўшых – у станіцы Андрэеўскай –
ёсць дзядзька Жора.
Я павінна вярнуць і дзядулю ў строй: нагадаць пачэснае імя.
Дзесяць гадоў – дзень пры дні – у тым ліку вайну...
Не змагаўся на фронце.
Толькі праліў бы кроў – за Бацькаўшчыну.
Аддаў бы жыццё – без астатку.

Вершы Кандауравай Наталлі

***

пераклад Смолка Вікторыі

Люблю цябе светла,
Люблю цябе свята,
Ахоўнік мой весні
І вораг закляты.

З прыемнай лагодай,
З тугою няўцешнай,
Люблю з асалодай
І з горыччу грэшнай…

І з кожным уздыхам
Глыбей і сардэчней!
Таемна і ціха,
Высока і вечна…

Да неба ўздымаю
Душою крылатай!
Мальбой абдымаю…
Мой любы. Закляты.

Ліст з Дзіцячага дома

пераклад Смолка Вікторыі

Мама, сягоння дождж,
Так разышоўся з ночы.
Толькі ты прыйдзеш, усё ж,
Побач пабыць захочаш?

У спальні бардак стаіць…
Ад вермішэлі прыкра.
Васька пытае, кпіць:
– Маму шукаеш? Знікла?

Я яму ў нос аперкот!
Слёзна крычу: – Замаўчы!
Змоўкні, зайздросны рот!
Сам ты зусім нічый!

Тодар Пятровіч нас
Палкай гразіўся выдраць,
Як у мінулы раз…
Сэрца калоціць крыўда…

Я не разбойнік, мам,
Добра магу вучыцца!
Верны маім сябрам –
З Васькай пайду мірыцца!

Будзем ганяць галубоў!
Есці з адной талеркі…
Только прашу ізноў –
Мама, не пі гарэлкі!

Пэўна, не прыйдзеш, усё ж,
Сам паганяю мячык…
Проста сягоння дождж,
А хлапчукі не плачуць!

Сыходзяць паэты

пераклад Смолка Вікторыі

Сыходзяць паэты
Хвастатай каметай
Увысь, на далёкі Парнас.
Расчуліцца Ліра.
Насуперак ветру
Памчыць іх крылаты Пегас.

У росах крыштальных
Адкрытым пытаннем
Пакінуць свой прывідны след…
А весняе ранне, празрыстае ранне
Раскрые чароўны іх свет!

Ташманава Фаіна Рашыдаўна, г. Стары Аскол, Белгарадскай вобласці

Інвалід дзяцінства, ДЦП. Мае 24 гады У 2013 годзе скончыла сярэднюю агульнаадукацыйную школу з залатым медалём, а ў 2019 годзе Белгарадскі дзяржаўны інстытут культуры і мастацтваў па спецыяльнасці «Менеджэр сацыяльна-культурнай дзейнасці». Працуе ў Цэнтры культурнага развіцця г. Старый Аскол. Піша сцэнарыі, песні для прафесійных і самадзейных калектываў Цэнтра. Станавілася пераможцам і прызёрам гарадскіх, абласных і Усерасійскіх конкурсаў паэзіі і аўтарскай песні. Пераможца абласнога конкурсу ў намінацыі «Лучший молодёжный гимн». Уладальнік Гран-пры фестывалю-конкурсу для моладзі з абмежаванымі магчымасцямі «Вальс Победы». Відэаролік, зняты на яе верш «Можем мы», заняў трэцяе месца ў конкурсе Сінадальнага інфармацыйнага аддзела Рускай Праваслаўнай Царквы. У 2016 годзе стала Лаўрэатам губернатарскай прэміі «Молодость Белгородчины» ў намінацыі «Літаратура». У траўні 2017 года ў выдавецтве «РОСА» свет пабачыла першая маленькая кніга для дзяцей «Азбука цветов». У 2018 годзе стала лаўрэатам трэцяй ступені Усерасійскага паэтычнага конкурсу «Зелёный листок», які праводзіцца Домам паэзіі Андрэя Дзяменцьева. У 2019 годзе атрымала перамогу ў намінацыі «Патрыятычная паэзія» на фестывалі «Зелёное яблоко» ў г. Пскоў.

Вершы Ташманавай Фаіны

пераклад Смолка Вікторыі

ДАР – ЖЫЦЦЁ

Нам сэрца – дар, каб ім любіць,
І думкі – дар, каб зноў тварыць,
І рукі – дар, каб не складаць,
Каб рупіцца і будаваць!
Трывога – дар, каб не сядзець
І праўдзе ў вочы паглядзець,
Нагода, каб сяброў склікаць,
Падман, каб ісціну шукаць!
А стома – дар, каб адпачыць
Ад дзённых спраў, каб уначы
І новы дзень, і светлы шлях
Убачыць у высокіх снах!
Сумленне – дар, каб жыць глыбей,
Не здраджваць людзям і сабе!
І кнігі – дар, каб іх чытаць,
Душой сталець, багатым стаць!
А сонца дорыць промень свой,
Каб азарыць Сусвет сабой!
Пытанне – дар – пазнаць адказ,
І вера – дар! У кожным з нас
Жывое сэрца, каб любіць,
Дары любоў, каб не згубіць,
Каб не згубіцца на шляху,
Паклапаціся хоць крыху!
А маеш голас – дык спявай!
А маеш сілы – паспявай!
А слова маеш – не тамі!
А маеш крылы – уздымі!

Чыстыя душы

пераклад Смолка Вікторыі

Светлыя твары, чыстыя душы...
Гэта не значыць, вымыцца ў душы,
У ручнічок загарнуцца па плечы
І на канапе паслаблена легчы.
Чыстыя душы, светлыя твары
Могуць сустрэцца і ў шумных кварталах,
Могуць у вёсачцы, ціхай, далёкай...
Ёсць і нямала сапраўдных навокал!
Белыя ночы, светлыя вуліцы,
Кожны, хто хоча, гэтым любуецца,
Кожнаму – шэрага неба кавалак...
Хто здагадаецца, казка ці ява?!
Ведай, усюды на гэтай планеце
Ёсць свая соль, *ёсць* разынкі... На свеце
Ёсць і Яны... Як завуць іх успомні –
Чыстыя, светлыя – веснія промні!
Хтосьці пяшком, а другі на калясцы
Хутка імчыць без патрэбы ў падказцы,
Падае ўніз, каб пасля падымацца
І, адпачыўшы, нястомна змагацца...
Ці па вадзе ты ідзеш, ці па сушы
Толькі сустрэнеш светлыя душы,
Чыстыя твары заззяюць усмешкай,
Каб прасвяціць запаветную сцежку –
І пераможа сонца над цемрай,
Над нематой у спазнанні таемнай
Чыстай крыніцы з жывою вадою!
Будзе лягчэй, калі побач з табою
Светлыя твары, чыстыя душы –
Час не патушыць.

Я – НЕ ПАЭТ

пераклад Смолка Вікторыі

Я – не паэт, я проста,
Рыфмуючы без сну,
Прасцінку слоў на кроснах,
Квяцістую, сную...
Глядзі, амаль гатова –
Цвітуць мае сады!
Я ведаю, што слова
Пазбавіць нематы!
І ціхую надзею
Абудзіць маладосць:
Скажыце, дзе я? Дзе я?
Якая прыгажосць!
О, край чароўны весні!
Сцяжынкаю радка
Ступіла ў рай нябесны...
Хай тчэ мая рука
Без сну са слоў прасцінку...
Што я магу яшчэ?
Крыштальнаю расінкай
Сляза мая цячэ...
Пішу я зноў пра кветкі,
Пра летнія дажджы,
І словы як таблеткі,
Як лекі для душы!
Прасцінка бы карцінка,
Дзіцячая зусім…
А сэрца, як хацінка,
Адчыненая ўсім!

Чэрвонная Таццяна Арцёмаўна, г. Краснадар

Нарадзілася ў г. Туапсэ 18.07.1997 г. З 2014 года жыве і працуе ў г. Краснадары. Па спецыяльнасці хімік. Вершы пачала пісаць з 11 гадоў. Першая публікацыя з'явілася ў мясцовай газеце ў 2009 г. З таго моманту і пачалася свядомая пісьменніцкая кар'ера. З 2016 г. з'яўляецца членам Міжнароднага саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтваў. Лаўрэат і пераможца краёвых і ўсерасійскіх конкурсаў. Вершы рэгулярна публікуюцца ў часопісах "Рыфмаград" (Масква), "Новае слова" (Стаўрапаль), "Мазайка поўдня".

Кісліцына (Ідалава) Таццяна, Свярдлоўская вобласць, г. Краснаўфімск

Нарадзілася 23 сакавіка 1987 года ў горадзе Краснаўфімску Свярдлоўскай вобласці, дзе і жыве ў цяперашні час. Больш за 15 гадоў працуе ў сферы журналістыкі.

Ніканчык Андрэй, Мінская вобласць, г. Барысаў

Нарадзіўся 4 верасня 1987 года ў сям'і вайскоўца. З 1994 па 2005 гг. – вучоба ў сярэдняй школе №13. 2005 – 2009 гг. – вучоба ў Барысаўскім дзяржаўным палітэхнічным каледжы. 2009 – 2013 гг. праца ў выпрабавальнай лабараторыі ААТ "Мінскі гадзіннікавы завод", вучоба ў Беларускім нацыянальным тэхнічным універсітэце. У цяперашні час – работнік службы бяспекі лагістычнага комплекса. Халасты. Вершы пачаў пісаць у малодшых класах школы. Удзельнік літаратурнага праекту «Хроники настроения» (г. Санкт –Пецярбург). Мае дыпломы рознай ступені за ўдзел у раённым літаратурным конкурсе. Прэзентаваў два зборнікі вершаў.

Цвірко Наталля Лявонаўна, Гродзенская вобласць, Шчучынскій раён, ст. Скрыбаўцы

Нарадзілася 01.07. 1980г. на ст. Скрыбаўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці. Закончыла Скрыбаўскую сярэднюю школу, Гродзенскі ўніверсітэт імя Я. Купалы. Працавала ў школах Гродзенскага раёна і г. Мінска. Цяпер працуе настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Скрыбаўскага дзіцячага сада-сярэдняй школы. Піша вершы на беларускай і рускай мовах. Друкуецца ў раённых, абласных і рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Пераможца абласных, рэспубліканскіх і міжнародных літаратурных конкурсаў. У верасні 2015 г. выйшаў зборнік вершаў " Крылы забытых мар", а таксама вершы надрукаваны ў сямі калектыўных зборніках. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 2017 года.

Вершы Чэрвоннай Таццяны

Тысячу разоў спачатку

пераклад Цвірко Наталлі

Белая пена на чорнай зямлі.
Вельмі стаміліся людзі баяцца.
Голыя камні пад лямант ляглі.
Нельга за іх чапляцца.

Крыкам аглушыць марская вада
Край. Не сціхае стыхія.
Толькі за што ўсім такая бяда:
Небу мы ўжо чужыя?

Вунь дыяменты-каменні плывуць,
Рвуць і кідаюцца, стогнуць.
А ізумруд каб хто мог праглынуць,
Ці быў бы свет каштоўней?

Цёмныя глыбы на хвалі ляглі.
Ах, як усё не гладка!
Коціцца пена па чорнай зямлі,
безліч разоў,
Спачатку.

Заўтра

пераклад Цвірко Наталлі

Заўтра я іншаю стану такой,
З патрэбнай ступлю нагі!
Дзверы змагу адчыніць нагой,
І дзень поцячэ з рукі.

Заўтра ўжо я дакладна змагу
Уражлівай быць. Але
Я ўсё кудысьці імкнуся, бягу,
Слабою не быць мне, не.

І калі заўтра спынюся, усё ж,
Ці гэта буду я?
Страх супыняе, нібыта нож.
Ці то адвага мая?

Заўтра па стрэхах шыбуе дамоў,
Прыспешвае цяжка крок.
Заўтра… Ці свету патрэба ў такой?
Так. Ведаю. Гэта любоў.

Восень

пераклад Цвірко Наталлі

Шапаціць пад нагамі
восень.
Праз пальцы
цячэ вадой
час, што не мелі.
Просінь
неба
за хмары схапіла рукой.
І здаецца,
што ўжо не толькі
ў прыродзе такая пара…
Дождж размывае
звонку,
Вершы не ў стане
стрымаць.
Я бачу, гарэза-восень
зрывае так нечакана
ўсе дзверы.
І прагна зносіць
апошнюю,
Там, дзе калыску
для лета
доўга хавала.
Наіўная, думала я,
каб лета даўжэй
засталося…
Жаўцее лісцё
паступова,
Што нам прахалода
Прыносіць?
Гучаць пад нагамі словы:
– Тваю абяцаную
восень.

Вершы Кісліцынай Таццяны

***

пераклад Цвірко Наталлі

Зірні, як шмат наўкол прастору!
Нам гэты светлы дзень прынёс
Блакіт нябеснага фарфору
У сціплым золаце бяроз.
І быццам летам прыпякае,
Відаць, што ўчора не здарма
Супольна камары ляталі,
А сёння холаду няма.

***

пераклад Цвірко Наталлі

Развітваліся, нібы ў сне
(Калі б было ўсё тое сном!)
Як бура рвала сэрца мне!
Палала як яно агнём!
Ды не магла сябе згубіць –
Хавала боль душы сама.
Заўважыла, што час імчыць,
На ганку ўжо расце трава.
І не блішчалі слёзы-соль,
Жальбе не паддалася я.
Нібы на сцэне мы з табой.
“Пакуль!” – цябе ў жыцці няма.

***

пераклад Цвірко Наталлі

Неба ў чырвоным і ветрык лятучы,
Цьмяная дрэваў сінеча…
Вечарам сэрца лепш бачыць чамусьці,
Словы ў ім светла трапечуць.
Мы пагаворым на захадзе сонца,
Рукі зноў сплёўшы з табою.
Можа, змагу, як калісьці, бясконца
Крылы ўздымаць над зямлёю?

***

пераклад Цвірко Наталлі

Памяць – сябар верны і апошні.
Колькі год хаджу я ў гэты храм?
Помню: летам сціпла, асцярожна
Прагуляцца ты паклікаў сам.
Аж праз тры прыступкі я скакала,
Наш пад'езд у гуле патанаў.
І кудысьці цені адступалі,
Ціхі вечар сэрца чараваў.

Вершы Ніканчыка Андрэя

Пад белую завіруху

пераклад Цвірко Наталлі

Ад мінулага каханнем не адкупішся,
Густ благі, калі ўсё зноўку паўтараецца:
Завіруха, вечар шэры аж насупіўся,
Прагуляюся, сустрэну часам п'яніцу.

Ратаваць яе пачну заўзята вельмі я
Шчыра вершамі, манерамі, прагулкамі,
Толькі пекары ў жыцці заўсёды верныя,
Зноў у доме будзе смачна пахнуць булкамі.

Надакучыць вобраз гэты прыхарошаны –
Хлопец кожны дзень такі ж, аж вочы муляе,
Голас кожны дзень гучыць яго няпрошаны,
Просіць моцна, каб забыла ўсё мінулае.

І дзяўчына ж у мінулае зноў кінецца,
Не збаіцца стаць старою ці падманутай.
Ну а я пад завіруху, як уздымецца,
Пагуляю …з прыгажуняй лепшай самаю.

Рукавічкі

пераклад Цвірко Наталлі

У зіму акунуцца б мне снежную,
Ды сябе адшукаць намалёваным,
У душу б учапіцца бязмежную,
У далоні дзяўчыны той сонныя.

Тым салодкім надыхацца водарам,
Калідорным, студэнцкім, просценькім,
Апрануць зноў кашулю з гонарам
І павенчаным стаць на досвітку.

Рукавічкі штодзень папраўляць бы ёй
На катку, немалым ды хібенькім.
Сустракаць ад бабулі нядзеляю,
І не ведаць імёнаў прыхільнікаў.

Толькі казкі даўно развенчаны…
Параслі мае шчокі вопытам,
Рукавічкі не грэюць больш вечарам,
Не ратуюць цяпер ад холаду.

Паспіваліся тыя дворнікі,
Ні катка, ні бабулі – прайшло, як дым.
А я сам змяшчаюся ў зборніку,
і пакуль яшчэ лёсам падмануты.

У тваім апынуся я сэрцы…

пераклад Цвірко Наталлі

У тваім апынуся сэрцы –
Прагані мяне з ціхім плачам.
Буду з ім толькі па-суседству,
Быццам хлопчык-паэт, няйначай.

Буду побач таптацца там недзе,
Вельмі смелы, адкрыты людзям,
З цеплынёй, на далонях, як вецер,
Толькі ведаць ніхто не будзе…

Я глядзеў, як, бывае, жорстка
За далонькі дзіцяці гінуць.
Сам над прорвай ішоў і проста
Усміхаўся ўсім штохвіліну.

Меркаванне прыліпла хворае,
Што жыву я нязнаны часам
Паміж геніяў, п’яных ад гонару,
Падпярэзаных славы пасам.

Увап’юся ў цябе з жаданнем,
Ды вядомыя сцісласцю таленты:
Памнажаць сабе ў сэрцы раны –
Дык, па-праўдзе, занятак так сабе…

Егіянец Сяргей, Рэспубліка Крым, г. Ялта

Нарадзіўся 6 верасня 1985 года ў Белгарадзе. З 1990 года жыве ў Ялце. З 2014 года займаецца выкладаннем, навуковай і выхаваўчай працай, перакладчыцкай дзейнасцю і журналістыкай. Мае вопыт працы ў школе, каледжы, універсітэце, навучальных цэнтрах дадатковай адукацыі. Выкладае англійскую і нямецкую мовы, замежную літаратуру, лексікалогію, гісторыю раманскай і германскай філалогіі.

Істомін Леў, г. Екацерынбург



Нарадзіўся 18 студзеня 1984 года ў Свярдлоўску, зараз жыве ў Екацерынбургу. Па адукацыі – гісторык. У 2007 годзе скончыў Уральскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, працаваў у школе настаўнікам і класным кіраўніком. У 2010 годзе змяніў профіль і заняўся журналістыкай. Зараз працуе намеснікам галоўнага рэдактара выдання «Камсамольская праўда-Екацерынбург». Вядзе блог, прысвечаны кінематографу, пераважна савецкаму, пад назвай «КиноНытик». У паэтычных конкурсах удзелу не прымаў. Жанаты, выхоўвае чатырох сыноў.

Казлоў Ягор, г. Тула

Дата нараджэння 20 верасня 1991 года. У 2009-ым годзе скончыў школу з залатым медалём, паступіў на горна-будаўнічы факультэт Тульскага дзяржаўнага ўніверсітэта, у 2015-ым атрымаў дыплом магістра. Публікаваўся ў літаратурных альманах. Аўтар двух зборнікаў вершаў. Сябра літаратурных аб'яднанняў «Московский Парнас» і «Пегас». Кнігі «Страна Цветов» і «Не смотри на часы» апублікаваныя ў электронным фармаце на сайтах грамадска-палітычнай газеты «Руская Бярозка», штотыднёвай усерасійскай газеты «Заўтра» і творчага праекта «Літаратурны калайдзер».

Школьнікаў Антон, г. Омск

Нарадзіўся 27 сакавіка 1988г. у г. Омску. Жыў у вёсцы Міхайлаўка Саргатскага раёна. Скончыў факультэт гуманітарнай адукацыі ОмДТУ па спецыяльнасці «Дызайн». З моманту заканчэння працуе па спецыяльнасці. Наведваў літаратурную майстэрню ОмДТУ, з'яўляецца членам літаратурнага аб'яднання пры СПРФ. Удзельнічаў у Міжнародным семінары перакладчыкаў прозы і паэзіі ў Сыктыўкары ў 2019 г., там жа рэкамендаваны да ўступлення ў СПР. Аўтар і выканаўца ўласных песень. Удзельнічаў у выданьні кніг вершаў омскіх паэтаў у якасці дызайнера і ілюстратара. Пераможца Усерасійскага літаратурнага конкурсу «У пошуках праўды і справядлівасці-2017» у намінацыі «Маладая паэзія Расіі». У 2018 годзе выдаў кнігу вершаў «Зіма і печка».

Мальшэўскі Антон, г. Смаргонь, Гродзенскай вобласці

Нарадзіўся 29 чэрвеня 1985года ў г. Маладзечна Мінскай вобласці. У 1995 годзе сям'я пераехала ў г. Смаргонь Гродзенскай вобласці. Першыя фотазамалёўкі, нататкі і вершы былі апублікаваны ў раённай Смаргонскай газеце "Светлы шлях". Вышэйшую адукацыю атрымаў ў Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце на факультэце "Выдавецкая справа і паліграфія", а таксама на завочным факультэце інстытута журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Леніна ў Мінску. Піша на рускай і беларускай мовах. Друкуецца ў раённых і абласных газетах, на інтэрнэт-сайтах. Падборка вершаў была апублікавана ў калектыўным паэтычным зборніку "Астравецкай зямлі галасы". Працуе ў раённай газеце "Астравецкая праўда" загадчыкам аддзела фотаілюстрацый.

Вершы Егіянеца Сяргея

Сябры і сяброўства

пераклад Мальшэўскага Антона

Як добра быць сярод сваіх сяброў,
Надзейных, шчырых, верных!
Няма ілжы, задум ганебных,
А ёсць адзінства поглядаў, высноў.
Сябры са мной заўсёды быць гатовы,
І вернасць гэта невымерна.
Са мной яны заўжды невыпадкова,
Не здрадзяць аніколі, я ўпэўнен.
Мы разам. І не толькі ў цяжкую часіну,
А і ў хвіліны радасці і шчасця,
Калі на піку ён сваёй вяршыні,
Да зорак дасягнуў скрозь страх і жарсці.
Калі спазнаў сяброўства – беражы,
Сябрамі па жыцці век даражы.

Імкненне

пераклад Мальшэўскага Антона

Я хачу жыццё пражыць годна і салідна,
Без хамства, кламства, невыносных зман.
Ліслівасці паддацца мне агідна,
Хай б’е ў душы адно святла фантан.
Хачу жыць у гармоніі і міры,
З жаданнем аднаго адзін любіць.
І як бы гул грахоў ні роў з эфіру –
Мяне з дарогі духу не зманіць!

Шпацыр за квасам

пераклад Мальшэўскага Антона

Неяк летняй раніцай я пайшоў за квасам,
Заспяваў я пра ката моцным гучным басам.
Раптам (вылез ты адкуль?) коцічак з'явіўся,
Пад басісты голас мой у вальсе закруціўся.
Вырашыў пайсці са мной, гэтак жа, за квасам,
Мышцы паразмяць яму трэба раннім часам.
Удваіх мы з ім ужо пра сабак спявалі,
На ваколіцу, людзей і не паглядалі.
Тут сабака падыйшоў, добры і кудлаты,
Заскуголіў, забрахаў вельмі далікатна.
Мы кампаніяй ідзём за гаючым квасам,
Пёсель тэнарам пяе, я – салідным басам.
Вось і вослік падаспеў, з ім тры папугаі.
Разам ловім пазітыў, весела спяваем.
Вось ужо амаль дайші – бачу бочкі з квасам,
Радасны і дружны кліч крыкнулі мы разам.
Напіліся квасу мы – бы з крыніцы раю,
У ім дабро і пазітыў – п’ём ды наліваем.
Піце гэты квас, сябры, з радасцю, часцей,
Каб жыццё заўжды было значна саладзей!

Вершы Істоміна Льва

пераклад Мальшэўскага Антона

Башлачову

На могілках адно
Жывыя душы
Распальваюць агонь,
А вецер тушыць.
Бяруцца за пяро,
І пішуць вершы:
Усё жыццё адно –
Хто горшы, лепшы.
Званоў самотны звон
За падалы чапляе,
І бура стогне зноў –
Нам розумы зрывае.
Магілу – яго кут –
Дакладна напаткаю,
Душа хадзіла тут,
Мая ж усё блукае.
Змяркалася ладком,
І снег іскрыўся,
Няпрошаным радком
Верш нарадзіўся.

Туман блакады над Нявой

пераклад Мальшэўскага Антона

Туман згушчаўся над Нявой,
Раўлі сабакі нема,
Апанаваны ўвесь смугой,
Жалейкі сумнай тэмай,

Паэт тут знойдзе пачуццё,
і словы звяжа рыфмай,
Ды потым. А пакуль жыццё
Апанавалі міфы.

Навошта рэзалі асфальт
Хадой няроўнай танкі?
Сном шэрым будуць вечна спаць
Тут рэшткі ды астанкі.

І ў небе зорачка адна,
Нібы ў душы надзея,
Скрозь жмуты-халады яна –
Апошняе адзенне.

Спавіла горад ліха-зло,
Прарвацца цераз межы
Не атрымалася ізноў,
Дрыжаць нам у бязмежжы.

Малітва сохне на вачах
Глытком хрыстовай веры,
І рассыпаецца ў прах
Замучанае цела.

Вершы Казлова Ягора

Калі растане леташні снег

пераклад Мальшэўскага Антона

Калі растане леташні ўжо снег,
І шэрасць хмар развее вецер цёплы,
Мы запаволім манатонны бег,
І ўбачым свет скрозь непразрыстасць вокнаў.

Ён прыме фарбы далікатнага цяпла,
і на прагалінах пралеска расквітнее.
І ў памяць словы прыйдуць спакваля,
Што нам падораць новыя надзеі.

Прачнецца лес, і спевы салаўя
Цурчаннем рэк адгоняць прэч завеі.
Растане лёд ад ласкі полымя –
Яго мы жар забыць ужо паспелі.

Пад сонечнай вясною знікне боль,
Бывае, мы накручваем падзеі.
Настане дзень, і ў свет да нас з табой,
Нарэшце, прыйдуць ясныя надзеі.

Настане дзень, і будзе новы ён,
Наш чысты ліст, замест адценняў снегу.
І зноў сатрэ той непрабудны сон
След лютага пад васільковым небам...

Міне зіма – як быццам не была,
У сэрцах бліскавіца ярка ўзыйдзе!
Было ў жыцці святла шмат і цяпла,
І, можа, зноў яно нас не абыйдзе.

Родная мая

пераклад Мальшэўскага Антона

Ты – шолах у пясчаным аксаміце,
Ты – роўнядзь неба, мора глыбіня.
І толькі ты мне зорачка ў зеніце,
Ты, родная мая.

Ты – свет, святло, прамень жыцця кіпучы,
Якія пранясуць мяне праз выдмы.
Ты – мост надзейны, кладка ў горных кручах –
Ці я ўсё выдумаў?

Ты – хваля радыё мая,
Што мчыш па неба шоўку,
З'явілася з марскога дна,
Адтуль, дзе вечнасць змоўкла.

Не ведаеш, ды мне, павер,
Незразумелы свет без цуда.
Я горыч страт сваіх цяпер
З табой забуду...

Няхай завея перашкод –
нас уратую я.
Тваё святло растопіць лёд,
Ты – родная мая.

Анёл-ахоўнік

пераклад Мальшэўскага Антона

Усе ў гэтым свеце ўцекачы,
Спяшаюцца туды, куды не трэба.
Матулі з немаўлятамі, бацькі
Натужліва бягуць, ляцяць наперад.

А ты схавалася між іх,
Адна з усіх, адна на свеце!
У снах заблукала сваіх,
У марах аб спякотным леце.

Але ў жыцці – усё не так,
Твой лёс пусты і нудны.
Ідзеш насуперак вятрам,
І побач я – нячутны.

Твой абаронца, твой сябрук,
Агню душы ахоўнік строгі.
Скрозь лес густы на светлы луг
Вяду цябе цераз парогі.

Ты зноў злуешся на сябе
За крок няслушны, што зрабіла...
А я прыжмуся да цябе,
Крану душу, каб не астыла.

Я побач быў заўжды з табой.
Хоць раз табе хацеў прысніцца!
Шкада, што шанец той парой
Ты не дала мне – нарадзіцца.

Вершы Школьнікава Антона

***

пераклад Мальшэўскага Антона

Зоркі вісяць над горадам,
Быццам на нітках тоненькіх...
Бог бараду пагладжвае
І прамывае пэндзлікі.

Выйшаў пейзажык сціпленькі.
Выйшлі мазкі зацяжкія:
Ноч абляпілі сонную
Вокнаў налепкі жоўтыя.

Двое ў акне з цыгарэтамі,
Рамамі перахрышчаны.
У раму пазногцем шкрабае
Чорнага клёну сколіна...

Хлопчыкам клён пасаджаны,
Трымае мужчыну п'янага ...
Ён маляваў пейзажыкі,
Ды маляваў з заганамі.

Струшчыўшы ствол на дошчачкі,
Фронт намалююць палонныя...
Бог накідваў эскізікі –
Намаляваў Сусветнае:

...Вечнасцю ў кут загнаны,
След пракладаючы ў Вечнасць,
Да дому ідзе зігзагамі
Малюсенькі
чалавечак.

Зіма і печ

пераклад Мальшэўскага Антона

У лапе яловай, нязжатым хлебе,
Лістоце гнілой
І на зямлі – зіма, і на небе,
І пад зямлёй...

Яна ў стагах, сабачых зграях,
Кашэчых снах.
Зіма. Не добрая і не злая,
Як ёсць. Зіма.

Не-не, ды снег абтрасеш гарбаткай
З панурых плеч:
Зіма – увесь свет. Чалавек і хатка.
А ў хатцы – печ.

Паводзіць вухам ля печкі котка
На брамаў трэль –
З марозу хтосьці глядзіць у вокны:
– Пусці, пагрэй...

Зіма. У сэрцах, на скронях ватных –
Яна ў правах...
– Сагрэю, што ж... Заходзь у хату.
Ды дроў давай.

Старая хатка так пахне сенам,
Я госцю рад.
І добра, што цераз дзіркі ў сценах
Сыходзіць чад...

…Са стомы хто, а хто з палявання,
Або з пацех...
Калі ў душу хто пастукае раптам,
Пускайце ўсіх.

Натопчуць – хай! Напаляць лішне,
Няма дзе легчы...
Не сцены грэюць.
Не грэе ліштва.
Тапіце ў печы.

***

пераклад Мальшэўскага Антона

Мітусімся, бо няспынны
Часу вечны калаўрот…
Лечыць час мяне, калечыць.
Гэта справа рук сяброў.

Зразумець я з імі здолеў
Шмат чаго. І бачыць Бог,
Лепіць час мяне і клепле
Шчэ рукамі ворагаў.

Утапіўся б! –
Дык жа зловяць –
Во, саломку
Склалі ў сноп...
Дзякуй вам на добрым Слове.
Мне цяпер хапае слоў!

Я за кожны крык бяссільны,
Вораг, дзякую табе!..
Ты страляў заўжды па крылах ...
Пёраў маю шмат цяпер.

Качаргіна Святлана, Прыморскі край, г. Уладзівасток

Нарадзілася ў горадзе Уладзівасток. Адукацыя – Лінгвіст і Магістр Вытанчаных Мастацтваў (Сарбона). Фіналіст сусветнага паэтычнага фестывалю «Эмігранцкая Ліра» (2015, Льеж / Парыж). Вершы публікаваліся ў літаратурных зборніках. У 2018 годзе выпусціла першы паэтычны зборнік «Итогдалие».

Малышава Лізавета, Маскоўская вобласць, г. Жукоўскі

24 гады. Нарадзілася і выросла ў пасёлку гарадскога тыпу Тужа Тужынскага раёна Кіраўскай вобласці. Першы верш напісала ва ўзросце 11 гадоў. У 2017 годзе скончыла Вяцкі дзяржаўны ўніверсітэт. У гэтым жа годзе паступіла ў магістратуру ВятГУ. У 2018 годзе апублікавала зборнік апавяданняў, у снежні 2019 выйшаў раман «Дзякуй, французскі». Лаурэат абласнога конкурсу, прысвечанага Вялікай Айчыннай вайне, усерасійскага фестывалю аўтарскай песні "Гринландия".

Фаміна Дар'я, Маскоўская вобласць, г. Балашыха

Нарадзілася 1 лістапада 1986 г. у г. Нагінск Маскоўскай вобласці. Пасля школы паступіла на факультэт рускай філалогіі Маскоўскага дзяржаўнага абласнога ўніверсітэта, скончыла яго ў 2009 годзе. У цяперашні час працуе рэдактарам-карэктарам, жыве ў г.Балашыха. Піша вершы і прозу з 13 гадоў. У цяперашні час супрацоўнічае з кампаніяй "Парамульт".

Марынец Алена, г. Гродно

Нарадзілася на Карэліччыне, у вёсцы Аюцавічы Гродзенскай вобласці 28.04.1987г. Пісаць вершы пачала яшчэ ў дзяцінстве. Друкавалася ў мясцовай раённай газеце “Полымя”. Пасля школы паступіла ў Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў. У гэты час друкавалася ў газетах “Вечаровы Гродна”, “Аркуш”, “Перспектыва”. У 2004 годзе быў выдадзены альманах “Нябесны знак”, дзе таксама былі надрукаваны яе вершы. З 2018 года ўдзельнічае у Міжнародным фестывалі-конкурсе паэзіі і паэтычных перакладаў “Берега дружбы”. Два гады запар з’яўляецца фіналістам гэтага конкурсу. Зараз - студэнтка Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта ім.Я.Купалы. Піша на беларускай і рускай мовах. Жыве ў Гродна.

Вершы Качаргіной Святланы

Аб прыродзе рэчаў

пераклад Марынец Алены

Паглядзі, сонца зноў устала
на квадраты, пасечаныя акном,
што для радасці раніцы мала,
пацярпі – гаворыць ніхто.

Мой карабель нерухомым здаецца,
прышвартаваны, плыве ён міма,
хтосьці да мэты бліжэй імкнецца,
ды ні на крок ён не стане шчаслівей.

Час заменіць на лепшых скора,
мудрагелістых, што ведаюць толк,
пэўна, у тым паслядоўнасць гісторый,
я твой сябар – кажа ніхто.

Свет – ілюзія, і ты прыдуманы
толькі ў сваёй галаве.
Дык выходзь з гаманы гэтай шумнай,
не капайся ў самім сабе.

Назірай, вучыся і слухай,
без ацэнак, сістэм, дактрын,
і хоць кожны хоча быць зухам,
мудрасць простая – быць нікім.

Я сустрэлася з табой задоўга да

пераклад Марынец Алены

Сустрэлася з табой задоўга да
таго імгнення, як мяне кранаўся;
дзе ў рэшата цяклі гады-вада,
і кідалі нас с крайнасці ў бяскрайнасць
чужых дзяржаў; дзе боль, вярней за ўсіх
душу абліжа языком шурпатым,
дзе мы жывём, – нібы далі пад дых,
ідзём насустрач хуткаплынным датам.

Сустрэлася з табой, калі быў снег,
над стрэхамі старэнькіх пантэонаў,
і каб не закрывалі мы павек,
іх нехта прыкрываў далонню. Хораў
упітвалі мы хлапчуковых спеў,
і кожны адчуваў паветра волі.
А каб сустрэцца, кожны разумеў,
як ёсць білет, дык блізка я даволі.

Вершы Малышавай Лізаветы

пераклад Марынец Алены

***

Міма ўсіх скрыжаванняў і ўсіх пратаптаных дарог,
Я па зоркавым полі хвалістым бягу наўздагад.
Ні граша за душой, за спіною апошні парог,
Я знікаю туды, дзе мігціць маіх мрой зарапад.

Шлях туманны стаіў і заблытаў мільёны сцяжын,
Як, не ведаю, мне разглядзець вярставыя слупы.
Але веру – не страшныя спёка, вятры і дажджы,
Пакуль травы на ранку казычуць расою ступні.

Па грудзях разліваецца хваля гарачай тугі.
Я нясуся скрозь жыта, пад неба падставіўшы твар,
Бо я ведаю, як мне вярнуць напамін пра даўгі,
Ганак бацькавай хаты, дзяцінства цудоўнага дар.

Пароцтва

пераклад Марынец Алены

Мы збудземся раніцай, чуеш?
Між тысячаў страчаных фраз,
На хісткім паломаным даху
Сустрэнем мы водбліскі нас.

У вальсе з табой на карнізе
Мы ўспомнім той горад і джаз,
Дзвюх душаў узнёслых эскізы,
Вачэй асляпляльных алмаз.

Нас прымуць дажджы, і туманы
Растворацьу марах начных,
Іводарам даўкім дурману
Спатканняў ахутаюць дні.

І Вечнасць спазнаўшы да донца,
Мы станем пяшчотней на грэх,
І нас абвянчае бясконцасць,
І больш нам не будзе памех.

***

пераклад Марынец Алены

Я бачыла святло, змагалася з ценем,
Я ведаю: маўчанне таксама спевы,
Калі застынеш у душэўнай коме,
Ці пасярод агоніі.

Казалі: шчасце ў сёмым вагоне,
А я дрыжала на пустым пероне
І помніла: мой – непазбежна першы,
У якім – дажджы і вершы.

У ім – кубак гарбаты з “траўкаю”,
І людзі смяюцца, як быццам гаўкаюць,
Мараць употай пра чорную каву
І катастрофу славы.

І я бегла вон з апошняй станцыі
У лес, да такіх жа, як я, паўстанцаў,
Хто аддаў сэрца вятрам і гору
І згінуў навекі ў моры.

Ды, можа, аднойчы ў сырую восень,
Я неба ўбачу ў вершалінках сосен,
І сэрца, заззяўшы вясновым сонцам,
Заб’ецца новым жыццём – бясконцым.

***

пераклад Марынец Алены

Шарэла, зямлю накрывала змярканне,
Сподачак ззяючы выпаўз увысі.
Сонныя травы самлелі ў маўчанні,
Пахі шапочуць: – Вярніся-вярніся!

Вандроўнік далёкі, стамлёны дарогай,
Што ў сваёй ношы хаваеш ад нас?
Шолах пяскоў акіянаў глыбокіх,
Мабыць прытойваеш у сініх вачах?

– У вузел сабраў я абшары радзімы,
Маміну ўсмешку і бацькаў наказ:
– Розныя сцежкі ляжаць табе, сыне,
Сэрцам прайдзі, не імкніся назад.

Вось і плятуся нязведаным краем,
Ветру сустрэчнаму выставіў твар,
У спадзяванні, што век не пазнаю
Здраднікаў тых, хто сябе сам прадаў.

Вершы Фаміной Дар'і

пераклад Марынец Алены

***

Люблю вясну: прыемны халадок,
Кіпіць зямля, і пішацца паэма,
І абуджаецца высокі дух-выток,
Аблашчаны гекзаметрам Гамера.
Зноў адраджэнне дразніць нам цярпенне,
Чытае дрозд на кронах "Іліяду",
А скрозь мяне праходзіць так прыемна
І цела студзіць сухавей заўзята.
Садзіцца сонца, ціха вечарэе,
А дрозд ўжо чытае "Адысею",
На караблі плыве там конь траянскі,
Насустрач Андрамедзе і Персею.
Зямля сагрэецца, абудзіцца ад сноў,
Дземетра прычакае Персефону,
І на паўгода расквітнее зноў,
Надзеўшы васільковую карону.

***

пераклад Марынец Алены

Сярэдзіна кастрычніка ішла,
Ліў дождж такі, як быццам бы з вядра,
У непагадзь сядзела дома я,
Самотна так і ціха ля акна,
Захутаўшыся ў цёплы плед,
Глядзела я на свой абед,
Што ў печы весела шыпеў,
І ўжо амаль зусім паспеў.
– Пусціце! Холадна, прамок!
Адкрыла дзверы я хутчэй.
А прада мной – дзіця-анёл,
Сцякалі кроплі з кучарэй.
Вочкі – дзве зорачкі-агні –
Дзівосны прыгажун такі!
Пусціла ў хату, накарміла,
Ля печы грэцца пасадзіла.
Маўчаў, а потым прашаптаў.
– Іскрынкі гаснуць, паглядзі. –
Схапіў свой лук – кахання стрэл –
І ў маё сэрца запусціў…
Затым між дзённага святла
Анёл мой незаўважна знік.
Я засталася зноў адна,
Цяпер сама я не свая –
Душа ў агні палае,
Так ноч праходзіць, за ім дзень –
Каханне сэрца паліць.
Надзея растае, як цень,
І вера прэч знікае.

***

пераклад Марынец Алены

Вецер злосны гоніць завею,
Моўчкі дрэвы глядзяцца ў лёд.
Па сцяжынцы плятуся і веру,
Што душы паратунак мой тут.
У зорным небе птушыныя зграі,
Растаюць, адлятаючы ў даль,
Варажу на свой сум у адчаі,
Зачапіўшы нябесную шаль.
На шляху завіруха сцяной,
Кроны дрэваў пужаюць дарогу –
Тут хацела знайсці я спакой,
Папрасіць прабачэння б у Бога!
Безсэнсоўна стукаць, крычаць
Ля забытага мною парога.
Засталося мне толькі маўчаць
І сачыць за астылай дарогай.
Крыж каменны свой цяжкі трымаць
І сціскаць ярка-вогненны факел,
Як сыходзіць між зорак анёл, назіраць,
Не стрымаўшыся грэшнай атакі.
Хліпкі снег на парэнчах, слізгоцце,
Зоркі з неба вясновага ззяюць
І ў марозных абдымках-пялёстках
З новым днём як адна патухаюць.

Абрамава Ксенія (Аксіння Данская), Растоўская вобласць, Няклінаўскі раён, с. Пакроўскае

Нарадзілася 25 верасня 1995 года ў горадзе Таганрог. З 12 гадоў пачала рабіць першыя крокі ў напісанні вершаў. У 2018 годзе пераехала жыць у с. Пакроўскае, У 2019 годзе адважылася надрукаваць свае першыя зборнікі, а таксама некалькі твораў увайшлі ў калектыўны зборнік “Дух сучаснай паэзіі. Выпуск 15” пад рубрыкай “Першая кніга”. З’яўлецца членам літаратурнага аб’яднання “Стэп”.

Бялкоў Дзмітрый, Рэспубліка Крым, горад Сімферопаль



Нарадзіўся на Урале. У сярэдніх класах з сям’ёй пераехаў у ХМАО, у г. Ханты-Мансійск. Скончыў ХМТПК. Пражываў і працаваў у Екацерынбургу, Цюмені, Чалябінску, Сургуце, Маскве, Сочы, Сімферопалі. У цяперашні час жыве і вучыцца ў г. Гомель. Займаецца ў Школе маладога літаратара УА “Гомельскі абласны палац творчасці”. Пачаў пісаць вершы са школьных гадоў.

Завізіён Алена, Маскоўская вобласць, г. Фразіна

Нарадзілася 21 снежня 2003 года, у горадзе Фразіна Маскоўскай вобласці. На цяперашні момант вучыцца ў фізіка-матэматычным класе звычайнай сярэдняй школы. З’яўляецца пераможцам і прызёрам гарадскіх этапаў ВСОШ па многіх прадметах. Акрамя таго, удзельнічае ў профільных алімпіядах па фізіцы, матэматыцы, філалогіі, лінгвістыцы.

Карлава Святлана, ЛНР, г. Луганск



Нарадзілася 23 лютага 1986 года ў горадзе Луганску. У 2001 годзе паступіла ў каледж Усходне-украінскага Нацыянальнага ўніверсітэта імя У. Даля на спецыяльнасць “Выдавецкая справа і рэдагаванне”, скончыла у 2005 годзе з адзнакай. У гэтым жа годзе паступіла ў Луганскі Нацыянальны педагагічны ўніверсітэт імя Тараса Шаўчэнкі на спецыяльнасць “Літаратурная творчасць”. У 2011 годзе скончыла са ступенню магістра філалогіі. На цяперашні момант працуе ў Луганскай моладзевай бібліятэцы.

Паўлоўская Аліна, г. Гродно



Нарадзілася 5 кастрычніка 1995 года ў горадзе Гродна. Скончыла ГрДУ імя Янкі Купалы, а таксама магістратуру ГрДУ. Працуе настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў СШ 40 г. Гродна. Фіналіст і лаўрэат I ступені міжнароднага фестывалю-конкурсу паэзіі і паэтычных перакладаў "Берагі Дружбы" (2019). Аўтар паэтычнага зборніка "За небакраем" (2015).

Вершы Абрамавай Ксеніі

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Святло ад лямпы, чысты ліст:
Я – ні на яве, а ні ў сне.
Іграе ў цемры восень твіст
Скрозь шчыліну ў старым акне.

Дашлю ў мінулае пісьмо
Сабе, наіўнай, як дзіцё:
“Чакаеш, прыйдзе ўсё само?
Забудзь, сама будуй жыццё!”

Мудрая восень

пераклад Паўлоўскай Аліны

Чым ты запомнішся, мудрая восень?
Рэдкім світанкам, апалым лістом,
Меддзю барвовай, парчой залатой?
Пройдзеш узбоч, незаўважанаю, босай?

Ці, можа, проста пакінеш на памяць
Стылую шэрасць за мокрым акном?
Кропляў марзянкай агучыш закон:
Можна, на свеце ўсё можна паправіць.

…Сэрца ўспамін у далонях зацісну,
Вільгаць тумана ўпадзе на лісток.
Скрозь пераменаў бясконцы паток
Я ў новы дзень адлятаю з дзяцінства.

Усмешка

пераклад Паўлоўскай Аліны

Усмешкі не шкадуй для самых блізкіх,
Раптоўным мінакам яе дары.
Яна – святло, схаванае ўнутры,
Ледзь чутны водгук на частотах нізкіх,

Няўлоўны чалавечым простым вухам,
А ўсё-такі – за душу закране…
Каханаму дары ў салодкім сне…
Дары яе сябрам сваім па духу.

Не заклікаю. Раніцай дажджлівай
Парой бывае ў сэрца рвецца сум…
Жадаю толькі: хай між змрочных дум
Цябе ў адказ усмешка ашчаслівіць.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Бушуе дождж, грукоча ў вокны.
Спакойна ў сэрцы адзінокім.
Святло маёй далёкай зоркі
Чакае хмар адліў.

Цямнее лес, сатканы тонка.
А думкі коцяцца патокам…
Глыбокі сон усё навокал
У міф ператварыў.

Вершы Бялкова Дзмітрыя

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Змяя.
Сямнаццаць вагонаў людзей і я,
У мятай футболцы,
З рукзаком на плячах,
Поўнай кішэняй цукерак,
Сшыткам, выкрасленым без меры,
І вачыма.
Мінск-Адлер.
Яшчэ міг і застылы за вокнамі свет
Папаўзе за плячыма.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Купал над мацерыком. Дым ківачом па інэрцыі за манекенам, і
Капае час. Час нібы воск. Воск па калена.

Мы самі стварылі гэту сістэму:
Пусцілі па венах час і, размеркаваўшы яго па сегментах,
Адмовіліся ад займеннікаў на карысць абмену.
Абмену сябе на валюту.
Таго сябе, найсапраўднага, што падобны на глюк
Па мерках сацыялагічных распрацовак,
Што з гадамі ўсё болей зацягваюць нам пятлю

на ланцугу закона.
Назіраем з балкона, брэшучы на крумкачоў
Выдыхаем скрозь зубы, жоўтыя ад нікаціну
і моцнага чыфіру, дым,
Пранікаючы ў інтэр'ер буды…

Ды свабода ярчэй шматкратна,
Як сіне-зялёны шарык,
Што ўздымаецца ўглыб сусвету,

пакуль ёсць гелій.
І ён лягчэй, чым паветра,
І пакуль свядомай свабодзе
Мы верныя.

Вершы Завізіён Алены

пераклад Паўлоўскай Аліны

Кава

Палае кава яркім пахам,
Кіпіць, аж млее, на агні.
І ўсё, што стала колісь прахам,
Нагадвае мне: ночы, дні,
Тугу, забытыя пакуты,
Няздзейсненай надзеі дым,
Сустрэчы і чаканняў смутак...
І намаганняў непачутасць.
Ты быў няварты іх зусім...
Яны прайшлі, імгненні болю,
Даўно распаўся страшны яд.
Ды тая ж мука... Сум па волі.
І кава, горкая ад страт.

Вясновы дождж

пераклад Паўлоўскай Аліны

Дажджавыя струны закранаюць душу,
Прымушаюць верыць, шэпчучы на вушка,
Каб адчула свежасць таямніцаў боскіх…
Сонца промні рэжуць неба на палоскі.
Пералівы фарбаў, кропель перазвоны,
Час сарваных масак, знятае заслоны.
Кліча дождж на волю. Там, дзе гук вясновы
Вылечыць ад болю, як святое слова.
Вее за празрыстым шклом любоўю ўсюды,
А на небе чыстым ажываюць цуды.

Прамень

пераклад Паўлоўскай Аліны

Густая цемра поле ўкрыла,
Запанавала цішыня.
Знік шчэбет птушак легкакрылых,
І песня ветру не чутна.
Ды раптам, як святла скажэнне,
З навіслых змрочных хмар агмень
Разрэзаў цемру – і свяшчэнны
Спусціўся на зямлю прамень.
Шлях прабіваючы цярністы,
Ён нёсся. Разагнаўшы змрок,
Зямлю крануў – і стаў празрыстым,
А навакольны свет замоўк.
Замерла ўсё, застыла ў бегу,
Прыціхла. Закаціўся дзень.
І толькі чорныя пабегі
Упарта даганяюць цень.

Вершы Карлавай Святланы

пераклад Паўлоўскай Аліны

У восені ёсць…

У восені ёсць нейкая таемнасць,
Нікім не разгаданая туга.
Пад ранак зноўку спіцца так прыемна,
Бусліны клін ахутвае смуга.

Так лёгка страціць восенню развагу
І часу, і прасторы пачуццё...
Смак восені – няўтоленая смага,
Ідэй і дум імгненнае збіццё.

У восені – актавы і накцюрны.
Вятрыска іх спявае на дварэ,
Кранаючы за сэрца, як за струны,
Што восень зваць тужлівай – проста грэх!

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Удар. Разрад. Мо, так таму і быць.
Ізноў разрад. Ды толькі міма.
Табе ўрачом прызначана служыць,
Глядзець на смерць няўмольнымі вачыма.
Змагаешся за міг, разрад і пульс,
Што ніткай роўнай цягне па экране.
Жыццёвы карабель не зменіць курс,
Хоць і рукой душы зацісnуць рану.
І яркай лямпай профілю палаць,
Апошнія хвіліны без звароту.
А муза не даруе, можа стаць,
Што словы лягуць лёгка і без поту.
Разрад. Удар. І сэрца зноў пайшло.
Паветра птушкай збітаю ўдыхаю.
Як добра, што на свеце ўсім на зло
Я зноў цябе без памяці кахаю.

Сучасныя прынцэсы

пераклад Паўлоўскай Аліны

Драбнее прынц. Цяжэйшыя часы.
Прынцэсы атам мірны ўтаймавалі.
Дзявочая рука важней касы,
Паверце, гэта важныя дэталі.

Прынцэса не сумуе ля акна,
Вядзе рахункі, банкаўскія кніжкі.
Магчыма, гэта не яе віна...
Што прынц ёй падаецца нейкім лішкам.

Прынцэсе даспадобы болей цмок,
Ён песціць, ад нягод яе хавае.
А прынц – калі дасюль дайсці не змог –
Няхай далей бясконны дзесь блукае.

Далёкі прынц – не варты ўвагі друз.
Прынцэсе трэба: дом, сям'я, турботы.
Яны цяпер – выдатнейшы саюз,
Цмок закаханы. Прынц? А ну ў балота!

НАД МАРАЮ НЕ ЎЛАДНЫ ЧАС

Пераклады з украінскай мовы

Вершы Раманенка Віктара

Карпаты

пераклад Сямінскага Пятра

Душа прывабіла трывогу,
І знік жыцця былы азарт.
З чужыны кліча зноў дарога
Ў Карпаты родныя, назад.
Карпаты, дзіўныя Карпаты,
Ці ў зеляніне, ці ў снягах,
Карпаты, любыя Карпаты,
Вы сум і радасць у вачах.
Карпаты, веліччу абняты,
Да вас душою прыпаду.
Карпаты, вы, мае Карпаты,
Я толькі тут сябе знайду.
Над светам праз дзесяцігоддзі
Заззяла новая зара.
І ўжо былога ў карагодзе
Жаданняў-мар прыйшла пара.
Карпаты, дзіўныя Карпаты,
Ці ў зеляніне, ці ў снягах,
Карпаты, зорныя Карпаты,
Вы сум і радасць у вачах.
Карпаты, веліччу абняты,
Я ніцма долу прыпаду,
Карпаты, вы, мае Карпаты,
Я з вамі зноў сябе знайду.
Крынічнай змыюцца вадою
І пыл з душы, і смецця стос.
Нібыта ў рэчку з галавою,
Я дам ныpца ў свой новы лёс.
Карпаты, дзіўныя Карпаты,
Ці ў зеляніне, ці ў снягах,
Карпаты, зорныя Карпаты,
Вы сум і радасць у вачах.
Карпаты, вечныя Карпаты,
Над мараю не ўладны час,
Карпаты, вы, мае Карпаты,
Вось я й вяртаюся да вас.

Вершы Карлавай Святланы

пераклад Паўлоўскай Аліны

***

Ад чаго, скажы мне, я сумую?
У даліну слёз мой шлях ляжыць.
Можа, нікуды я не кірую,
Бо ўжо маю рану на душы…

Раскажы мне, як жа бачаць людзі
У блакіце неба караблі?
Медны вобад зацiскае грудзі,
У вачах імгла, няма зямлі.

Намалюй мяне – у думках фарбай
Радасці, нягоды… Акрылі!
Перашкоды могуць здацца скарбам,
Калі хочаш быць, нібы Далі.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Ты не болей, чым звычка да болю,
Ланцужок з летуценняў балючых.
Занядбанае дзікае поле
З пустазеллем, сухім і калючым.

Мімаволі ў сабе адчуваю
Пах трывогі, сціраюцца межы.
Але час ад цябе не схавае
Вока памяці, злосны драпежнік!..

Асячыся… Замоўкнуць, прывыкнуць.
Я душа ўжо без цела, без плоці.
Не патрэбна нікому, я знікну
У адвечным кругазвароце.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Ты прабач, што цябе пазбягаю,
Сам спаліў сваё шчасце ў агні.
Ты не ведаў, як моцна кахаю,
Я не ведала – ты мяне сніў.

Ты гуляў. Не змыкаючы вочы,
Я сядзела і каву піла.
Не сустрэліся цёмнаю ноччу,
Бо чужою табе я была.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Мы ў рыззі абарваным блукаем,
Сустракаючы страту за стратай.
І нібыта сляпыя – рукамі
Адшукаць намагаемся фатум.

Скрозь стагоддзе ступаем павольна,
Забываючы сон-адпачынак.
Дзве душы, што злучыў паядынак,
І нішто раздзяліць нас не здольна.

***

пераклад Паўлоўскай Аліны

Апошняй кропляй падае ў крышталь
Скупога сонца зарыва. Прыроды
Асенні смутак і зімовы жаль
Расказваюць пра лёсу перашкоды.

І яблыка смарагд, віна бурштын
Так вабяць і жаданнем зрок чаруюць.
А ў сэрца пранікаюць да глыбінь
Цяжкія думкі, што мяне гартуюць.

Сівеюць косы ў млявым забыцці.
Пакрыла павуціннем сінім рукі.
І голас мой няўпэўнена прыціх,
Ахрыплы ад працяглае разлукі.

ЗМЕСТ

Вершы Бекрашавай Ларысы……..6
Вершы Дашко Аляксандра 9
Вершы Жалязоўскай Лідзіі.....14
Вершы Звягінай Вольгі.....16
Вершы Ушакова Віктара 21
Вершы Шаблаковай Вольгі.....24
Вершы Андрыянавай Крыстыны 30
Вершы Чакуновай Маргарыты.....34
Вершы Дзіка Мікалая 41
Вершы Раманенка Віктара 43
Вершы Раўчанка Вольгі 49
Вершы Кандауравай Наталлі 51
Вершы Ташманавай Фаіны.....55
Вершы Чэрвоннай Таццяны 59
Вершы Кісліцынай Таццяны 62
Вершы Ніканчыка Андрэя 63
Вершы Егіянеца Сяргея.....68
Вершы Істоміна Льва 70
Вершы Казлова Ягора.....72
Вершы Школьнікава Антона 75
Вершы Качаргіной Святланы 79
Вершы Малышавай Лізаветы.....81
Вершы Фаміной Дар'і 85
Вершы Абрамавай Ксеніі.....89
Вершы Бялкова Дзмітрыя.....91
Вершы Карлавай Святланы 93

Вершы Раманенка Віктара 96
Вершы Карлавай Святланы 97

З цеплынёй на далонях

Пераклады з рускай мовы

Усе творы апублікаваны ў аўтарскай рэдакцыі

Вёрстка: Ю. С. Кавыліна
Дызайн: Д. М. Кавылін

Падпісана ў друк 30.06.2020 г.
Фармат паперы
Гарнітура Times New Roman
Друк трафарэтны.
Тыраж 100 экз. Ум. друк. арк. 6,375
Надрукавана ў тыпаграфіі выдаўца
ІП Ступін С.А.
Растоўская вобласць,
г. Таганрог, Лермантаўскі зав., 25
311-288@ mail.ru
тэл. +7(8634) 311-288.